...трылетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год...

НОВЫ НУМАР У 5 НАП.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял вяртаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Неўкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 60 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. — к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазвалены. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. шэлягу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрадоўж. і чарнапаркоўцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

№ 273 (2762) Нядзеля, 1-га сьнежня 1929 г.

М кр. "Савецкая Беларусь" Отдел. Пастараўз, государ-стан. публичн. библиотека. ступ. экзэмп. адзін экз.

...чора адчынілася Менская акруговая канфэрэнцыя ударных брыгад.

На заклік Ленінскай камуністычнай партыі рабочая кляса з запалам і энтузіязмам, цьвёрда і ўпэўнена ідзе па шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

...пітасная вайна прагулам і нядбайнасьцям на прадпрыёмствах, усе сілы на ўздым вытворчасьці працы, на паляпшэньне якасьці прадукцыі, на датэрміновае выкананьне пяцігодкі—вось голас дэлегатаў зьезду, голас менскага пралетарыяту.

ПРАВЫЯ ЎХІЛІСТЫ І НЫЦІКІ ЯШЧЭ РАЗ АТРЫМАЛІ НАЛЕЖНЫ АДКАЗ АД РАБОЧЫХ.

...АДЧЫНЕНЬНЕ КАНФЭРЭНЦЫІ.

...а ...ўвечары ў клюбе Карла ...а адчынілася Менская акру...канфэрэнцыя ўдарных бры...і. канфэрэнцыю да моман...ыненьня прыбыло 274 дэ... Прысутнічае шмат чась...бочых менскіх фабрык і ...

...эрэнцыю адчыніў адказны ...р ЦСПСБ т. Аверын. У прэ...і абрана 43 чалавекі, ся...т. т. Славінскі, Дамброўскі, ..., Хлеўнікаў, Конюхаў, Аве...озін, Калодка, старшыня ...т. Грысевіч і шэраг рабо...арнікаў фабрык, заводаў ...саў Меншчыны.

...ром воплескаў прымаецца ...ва рабочага т. Мінкова ў ...ы прэзыдыум абраць са...тыўнага нашага ўдарніка ...аліна.

...рэзыдыум, пад воплескі ўсёй ...энцыі запрашаюцца Бюро ...(б)Б і Старшыня ЦКК-РСІ ...ав. Калін.

...ярджаецца парадак дню, ...рэнцыя ўдарнікаў прыступ...практычнай працы. Даклад ...аму пытаньню—перспэк...гаспадарчага будаўніцтва ...-30 г. і задачы рабочае ...трабіў сэкратар акругкому ...т. Славінскі, сустрэнуты ...воплескамі.

...я дакладу т. Славінскага ...буну адзін за адным усхо...прадстаўнікі дэлегацый ра...бочых чыгункі, фабрык, заводаў, Чырвонай арміі і савгасаў, якія прышлі прывітаць першую акруговую канфэрэнцыю ўдарнікаў.

Кожны з прамоўцаў рабочых, які вітаў канфэрэнцыю, рапартаваў аб тых дасягненьнях, якія маюцца на яго прадпрыёмстве ў выніку сацыялістычнага спаборніцтва. Рабочыя запэўнялі камуністычную партыю і канфэрэнцыю ўдарнікаў у тым, што на дасягнутых посьпехах яны ні ў якім разе ня спыняцца, а яшчэ больш шпаркімі крокамі будуць падымаць працоўную дысцыпліну, прадукцыйнасьць працы і якасьць прадукцыі. Рабочыя, усе як адзін, заяўлялі, што яшчэ большым тэмпам будуць выконваць пяцігодку. Мы выканаем яе максімум у 4 гады,—вось адзінадушны голас усёй рабочай масы Меншчыны.

Правыя ўхілісты і ныцікі яшчэ раз атрымалі добры адказ ад рабочае клясы, якую не задавальняюць узятыя тэмпы індустрыялізацыі і будаўніцтва сацыялізму і якая патрабуе гэтыя тэмпы ўзмацніць. Рабочыя заяўлялі, што ім ня страшны ўсе цяжкасьці і што яны з яшчэ большым энтузіязмам будуць выконваць задачы, пастаўленыя яе правадыром—камуністычнай партыяй.

З адказам на прывітаньні выступіў старшыня ВСНГБ тав. Грысевіч.

...цігодку выканаем у 4 гады.

...ат акруговай канфэрэн...ных брыгад т. **Казлоўскі** *...—рабочы Барысаўскага ...воду імя „Домбаля". На заводзе працуе з 1900 г., ...ў шэраг гадоў на Маль...заводах, наогул-жа ў ...абочым стажы налічвае ...*

...што ён апавядае аб ударных ...свайго заводу.

...пісалі мы,—кажа ён,—дагавор ...лістычным спаборніцтве. Па...іж сабой гаварыць: калі пад ...былога фабрыканта работалі ...бра і выпускалі шмат пра...дык няўжо мы зараз на за...паспадаром якога зьяўляецца ... кляса, ня можам паставіць ...аму лепш, чым раней пры ...ще.

...і вырашылі арганізавацца ў ...брыгаду. У мяне за 43 гады ...ня было ніводнага прагула. ...паставілі перад сабой задачу ...ь канчаткова прагулы, пад...ніць прадцысцыпліну, вытворчасьць працы, зьнішчыць процант браку, палепшыць якасьць прадукцыі і павялічыць выработку.

— З пачатку ў нашай зьмене ў брыгадзе было 20 чалавек, паступова колькасьць іх павялічвалася. Падняли дысцыпліну, зьменшылі выхад браку, павялічылі колькасьць выпускаемай прадукцыі.

— Зараз ужо ўся наша зьмена,—каля 100 чалавек рабочых, лічыцца ўдарнай. Кожныя 10 дзён мы падводзім вынікі сваёй работы. Вось за апошнюю дзесяцідзёўку ў зьмене ня было ніводнага прагулу. Мы зараз зварачваем вельмі сур'ёзную ўвагу на палепшаньне якасьці прадукцыі, а таму цакуль што ў галіне колькасьці стаім на адным узроўні. Усё-ж наш завод сваю вытворчую праграму за 1928-29 г. выканаў на 110 проц. Спадзяемся, што выпуск прадукцыі павялічым.

— Па нашаму заводу пяцігодку мы мяркуем выканаць менш чым у чатыры гады.

Даёш буйныя савгасы.

...ат канфэрэнцыі—рабо...гасу „Бярэзіна" т. Кава...Іван у гутарцы з нашым ...нікам зазначыў, што рабо...авгасу ўхваляюць лінію пар...тварэньню буйных савгасаў. ..., кажа ён, на сваім савгасе ...эўніліся, што такая дробная ...а, як наша—усяго 150 гэк...ла варта, бо на ёй далека ня ...

Рабочыя на вытворчай нарадзе ня раз падымалі пытаньне аб узбуйненьні савгасу за лік вакольных зямель і гэтае пытаньне трэба вырашыць у станоўчы бок.

— Наш савгас шэфствуе над вёскай „Чырвоны Бераг", беднаце якой мы дапамагаем сваімі коньмі, даём насеньне. Сярод беднаты і серадняковуў гэтай вёскі праводзілі працу па ўцягненьні іх у арганізацыю калгасу.

...дымаем вытворчасьць, зьніжаем сабекошт.

(Рабочы савгасу «Блонь»).

...году ў год ураджайнасьць па...ага савгасу павялічваецца. ...6 годзе мы з гэктара зьбіра...цэнтн. жыта, 6,7 цэнтн. аўса, ...ж сабралі з гэктара больш ... жыта, аўса—13,5 цэнтн., ...абралі 114 цэнтн. з гэктара. ...году ў год зьніжаецца і сабе...адукцыі сельскай гаспадаркі: ... з 14 руб. 50 кап. да 7 р. ...у мінулым годзе, па аўсу— ...да 3 руб. 33 кап., па бульбе ...руб. 03 кап. да 1 р. 14 кап. ...ета наш савгас здаў каапэ...ыі 30 тон жыта. Рабочыя ...падпісаліся на 100 проц. за...на пазыку індустрыялізацыі, ... 2450 р.

...вокал савгасу ёсьць 2 яўрэйскіх земляробскіх калектывы, сёлета арганізаваўся ў вёсцы Цешкаў калгас з 150 гаспадарак і ў в. Леццо—калектыў з 96 гаспадарак. Савгас апошняму калектыву трактарам узараў пад зяб 20 гэкт.

Наогул калектыву аказваем дапамогу як машынамі, так і насеньнем. Праводзілі ачыстку насеньня калгасьнікам і насельніцтву—усяго сёлета ачысьцілі 161 тону насеньня.

— Ня так даўно ў нас арганізавана ўдарная рабочая брыгада, у якую з часам спадзяемся ўцягнуць усіх рабочых. Ставім перад сабой задачы падняць дысцыпліну, вытворчасьць палепшыць савгасу і яшчэ больш зьнізіць сабекошт прадукцыі і пашырыць работу па калектывізацыі.

...К КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ЦВК БССР.

...нскія рабочыя—прыхільнікі радыё і радыё-слухачы, сабраў...і сваю другую канфэрэнцыю, пасылаюць радыё-прывітаньне ...ам сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі.

..., удзельнікі канфэрэнцыі, узбройваючыся тэхнічнымі ве...дзем моцна трымаць у сваіх руках магутны сродак куль...тэвалюцыі—пралетарскае радыё.

...ім актыўным удзелам у радыёфікацыі і радыёвяшчаньні ...й Беларусі—будзем дапамагаць камуністычнай партыі ў яе ... адказнай рабоце на пабудове новага сацыялістычнага быту.

...хай жыве арганізатар і кіраўнік нашага сацыялістычнага ...ніцтва—ЛЕНІНСКАЯ ПАРТЫЯ.

ПРЭЗЫДЫУМ КАНФЭРЭНЦЫІ.

Мы мала ведаем аб перадавых байцох сацыялістычнага будаўніцтва

Дасягненьні, якія мы маем у выніку праведзенай масавай праверкі сац. спаборніцтва на прадпрыемствах, пры актыўнейшым удзеле соцен рабочых брыгадзіраў — сьведчыць, што задачы і значэньне сац. спаборніцтва, у яго шырокім палітычным сэнсе, даведзены ня толькі да заводу, але і да цэху, а ў асноўным і непасрэдна да кожнага рабочага паасобку ў сэнсе усьведамленьня ім яго клясавых абавязкаў, якія патрабуе ад яго вялікая сацыялістычная будоўля. Наша ударніцтва, як мэтад камуністычнае працы, як форма барацьбы з усялякім праяўленьнем коснасьці, сьпячкі і «абломаўшчыны», як лепшае выражэньне новых сацыялістычных тэмпаў, бязумоўна, узьнялося на больш высокую ступень, атрымаўшы свой выраз у пераходзе на шэрагу прадпрыёмстваў ад ударных брыгад да ўдарных цэхаў і нават да цэлых ударных фабрык (хлебазавод—Менск, ф-ка „Скараход"—Віцебск).

Але побач з гэтым праверка сац. спаборніцтва выявіла і шмат буйнейшых недахопаў, на зьліквідаваньне якіх і Менскаму Акруговаму Зьезду ўдарнікаў прыдзецца зарастрыць сваю ўвагу.

Па што рабочыя брыгады пры праверцы сац. спаборніцтва наштурхнуліся амаль—што ва ўсіх фабрыках і заводах? Якія мы маем амаль—што адзінадушныя заявы усіх таварышоў з ЦСПСБ і Акрпрофбюро, якія працавалі на гэтых прадпрыёмствах адносна становішча ўдарных брыгад? Агульная характарыстыка становішча такая: мы мала ведаем аб нашых гэроях сацыялістычных будняў, мы мала рабілі, мы не скарыстоўвалі усіх нашых магчымасьцяў, каб праз усю сыстэму нашай палітыка-асьветнай працы ў масах папулярызаваць лепшых энтузыястых на вытворчасьці, своечасова аказаць ім дапамогу і падтрыманьне; акружыць іх штодзённай увагай і клопатам; рашуча разаблачаць усіх тых, якія прабуюць утвараць атмасфэру траўлі навакол лепшых ударнікаў.

Адзначаецца яшчэ адно буйнае упушчэньне, якое зьяўляецца агульным для усіх амаль-што прадпрыемстваў: гэта адсутнічаньне ўсякага вучоту працы ударнікаў на вытворчасьці, па колькасным і якасным паказальнікам. Гэта не дае магчымасьці наглядна даказаць рабочым дасягненьні ўдарных брыгад, наколькі, напрыклад, апраўдываецца пераход, скажам, на павялічаную колькасьць машын, варштатаў, ці на новыя мэтады працы, каб гэтым самым выклікаць інтарэс у тых, якія адстаюць у сэнсе раўненьня іх на перавачам. Мы яшчэ і зараз паштурхваемся на коснасьць і нярухомасьць з боку фабкомаў і вытворчых камісій у сэнсе хуткага падхопу ініцыятывы паасобных рабочых і цэлых ударных брыгад для шырокай яе папулярызацыі. А трэба сказаць, што творчая думка рабочых моцна забілася. Мы кожны дзень наглядаем новыя шукань ні, новыя мэтады працы, якія прахо дзяць над дзёзунгам: „дагнаць і перагнаць"...



Ударнікі майстэрні малага рамонту пас. вакз. у выхадны дзень адрамантавалі 1 пас. вагон дальняга шляху ў карысьць Д.-У. Чырв. арміі і выклікалі ўсе майстэрні дэпо ўзяць з іх прыклад.

Возьмем хаця-бы такі факт; група работніц—ударніц Віцебскай панчошна-трыкатажнай ф-кі некалькі часу таму назад перайшла з 3 пасочных машын на 4—кожная. Але у выніку аказалася, што такі пераход ня даў чаканага колькаснага эфэкту і работніцы парашылі перайсьці на каляктыўную форму працы, г. зн. 3 работніцы на 12 машын, пры строгім разьмеркаваньні працы і гэта адразу дало свой эфэкт: колькасьць выпрацоўкі павялічылася на 3—4 дзесятка у дзень.

Як-жа да гэтага аднеслася вытворчая камісія? Ці абгаварыла яна гэтае пытаньне? Ці ставіла яна на вытворчай нарадзе для папулярызацыі і шырокага прымяненьня? Ці утворана вакол гэтага „сьмелага кроку" неабходная вытворчая атмасфэра і грамадзкая думка? Вядома, пакуль-што—не. Так гэтая ідэя пакуль-што тлее ўнутры самаго, так званага, калектыву, яна, можа, і захапіла блізка стаячую групу работніц, але далей яна не пайшла. Фабрыка аб ёй ня ведае.

Ёсьць і іншыя выпадкі, калі, замест таго, каб выклікаць рабочых і работніц і пагутарыць з імі наконт упе сенага праэкту, вельмі-та „вумныя галавы" раней доўга разважаюць, ці варта наогул аб гэтым гаварыць? Ці ня хімэрыя гэта, ці не фантазія? Зразумела, наштурхваючыся на такі халадок, зачастую гіне самая лепшая ініцыятыва рабочых, найлепшыя намеры.

У сілу такіх адносін да ўдарных брыгад зусім ня дзіўна, калі у шэрагу выпадкаў рост колькасьці ударнікаў і ударных брыгад затрымліваўся, паасобныя групкі закансэрвіраваліся, замкнуліся ў сабе, а у паасобных выпадках нават і распадаліся (ф-ка „Дзьвіна" і завод „Чырвоны Металіст" у Віцебску). На панчошнай ф-цы, напрыклад, мелася на 1 кастрычніка усяго 23 ударніка, раскіданых па цэхам і не аформленых у ударныя брыгады на 1200 рабочых і работніц, пры паяўнасьці на ф-цы 200 камсамольцаў, 90 камуністых і 126 прафактывістых; на швэйнай ф-цы „Профінтэрн" (Віцебск) ня было ні воднай ударнай брыгады. У сучасны момант мы ўжо маем, у выніку праверкі сац. спаборніцтва у адносінах да ударнікаў з боку усіх арганізацый заводу, значны пералом: утворана навакол іх неабходная вытворчая абстаноўка, ёсьць таксама значны рост ударнікаў і ударных брыгад. Узяць хаця-бы розьніцу на той-жа панчошнай ф-цы. На 20-XI ужо мелася 176 ударнікаў, аформленых у 17 ударных брыгад. Ініцыятыўная група рабочых вязальнага цэху ужо зрабіла выклік рабочым, каб абвясьціць увесь цэх ударным; таксама паступіла ініцыятыўная група рабочых адной зьмены матальнага цэху.

* * *

Задача партячэек, фабкомаў і гаспадарнікаў—зараз гэты пералом замацаваць і ўсялякі садзейнічаць — і кіраўніцтвам, і справай і дапамогай — разьвіцьцю ўдарніцтва, упядрэньню мэтадаў камуністычнай працы ў вытворчасьці і найхутчэй пакончыць з тымі галоўнейшымі недахопамі, на якіх мы вышэй застанавіліся.

Ад ударных брыгад да ўдарных цэхаў і ўдарных фабрык і заводаў — гэта задача павінна стаць нашым штодзённым клопатам.

А самае галоўнае, усю сыстэму нашай работы ў масах скарыстаць для таго, каб піянэраў камуністычнай працы, перадавых байцоў сацыялістычнай будоўлі ведала ўся наша краіна, ведала ўся рабочая кляса і ўсе працоўныя ў нямецкай меры, як мы ўсе ведалі аб нашых гэроях чырвонаштандарца ў грамадзянскай вайны.

— А мы іх пакуль-што мала ведаем!...

Б. Табайнік.

ПРЫВІТАНЬНЕ КАНФЭРЭНЦЫІ.

Шчыра вітаем менскую акруговую канфэрэнцыю ўдарных брыгад—перадавы атрад з фронту сацыялістычнага спаборніцтва.

Прэзыдыум ВСНГ БССР упэўнен, што і ў далейшым ударнікі, арганізоўваючы і накіроўваючы творчаскую ініцыятыву і энэргію рабочых мас фабрык і заводаў у справе індустрыялізацыі і ўзмацненьня тэмпаў сацыялістычнай перабудовы народнае гаспадаркі будуць даваць сапраўдны ўзор камуністычнай работы.

Прэзыдыум ВСНГ БССР.

Сводка з фронту сацыялістычнага спаборніцтва.

ЗАВОД „КАМУНАР" сваю вытворчую праграму выканаў толькі на 98,1 проц. Сабекошт прадукцыі замест 8 проц. па плану фактычна зьніжан на 6 проц. і то толькі па 45 проц. прадукцыі. Праўда. У 4 КВАРТАЛЕ ЁСЬЦЬ ЗНАЧНЫ ПЕРАЛОМ У ЗЬНІЖЭНЬНІ САБЕКОШТУ, ЯКІ СКЛАДАЕ ЎЖО 10,6 ПРОЦ.

Прадукцыйнасьць працы павялічылася на 6-7 проц, супроць прадугледжаных плянам 17,5 проц, Процант прагулаў зьніжан з 1,05 проц. да 0,31 проц.

* * *

ЗАВОД „ЭНЭРГІЯ" сваю вытворчую праграму выканаў на 111 проц. Недастатковыя вынікі ў галіне падвышэньня прадукцыйнасьці працы. Сабекошт прадукцыі зьніжан на 8,5 проц. замест плянавых 8,4 проц. Аднак гэта ліква ахапае незначнае кола прадукцыі.

Зварачае на сябе ўвагу значны процант прагулаў—1,01 проц., які трымаецца на адным і тым-жа ўзроўні.

* * *

ПАПЯРОВАЯ ФАБРЫКА „ПРАФІНТЭРН". Вытворчая праграма выканана на 103,6 пр. Сабекошт замест 10,6 проц, за год у середнім зьніжан на 4,5 проц. Адначасова трэба падкрэсьліць, што замест павялічэньня сабекошту ў першым паўгодзьдзі У ДРУГІМ—ЁН ЗЬНІЖАНЫ НА 14,7 ПРОЦ. ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ ЗАМЕСТ ПРАДУГЛЕДЖАНЫХ ПЛЯНАМ 38 ПРОЦ. ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ НА 51,2 ПРОЦ.

Прагулы зьнізіліся з 1,06 проц. да 0,31 проц, у цэлым за год складаюць 0,8 проц. супроць 2,6 проц. за ўвесь 1927-28 год. Зварочае на сабе ўвагу значны процант простою машын, які ў 4-м квартале дасягнуў амаль 20 проц.

* * *

ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА „ОКТЯБРЬ". Сабекошт зьнижан на 6,5 проц. замест 7,1 па сацдагавору. Ёсьць прыкметныя дасягненьні ў справе зьнижэньня прагулаў. Так, з 1,38 проц. у першым квартале прагулы зьнізіліся да 0,36 проц. у верасьні.

Імпэрыялісты абараняюць кітайскіх авантурнікаў.

Сусьветны пралетарыят дасьць рашучы зьніштажаючы адпор

Пралетарыі вітаюць з перамогамі Далёка-Усходняю і яе кіраўніка—УсеКП(б)

БЭРЛІН, 29-11. Паведамленьне аб капітуляцыі Мукдэнскага ўраду атрымана ў момант пасяджэньня пленуму ЦК кампартыі Нямеччыны. Зачытанае Тэльманам паведамленьне гэтае выклікала вялікі ўздым сярод удзельнікаў пленуму. Пленум паслаў прывітальную тэлеграму ЦК УсеКП(б).

Кіраўніцтва забароненага саюзу Чырвоных франтавікоў і юнацкая арганізацыя чырвоных франтавікоў паслалі прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) на імя Сталіна і асобай Далёка-Усходняй арміі на імя т. Блюхера.

Прывітаньні пасланы таксама ад працоўных Водынгу, прадстаўнікоў берлінскіх друкароў і іншых. Кіраўніцтва берлін-брандэнбурскай арганізацыяй КП Нямеччыны зьвярнулася з адозваю да працоўных Бэрліну, у якой тлумачыцца значэньне апошніх падзей.

* * *

ЧЫТА, 29-XI. Паведамленьні друку аб адпору, дадзеным часьцямі Далёка-Ўсходняй арміі кітайскім генэралам, спатканы тут з выключным уздымам. На шматлікіх мітынгах рабочыя пасылаюць бальшавіцкае шчырае прывітаньне слаўнай Далёка-Ўсходняй арміі і заяўляюць, што яны ў кожную хвіліну возьмуць у рукі вінтоўку.

Рабочыя даюць адлічэньні ад заработку, праводзяць суботнікі для дапамогі параненым і патрабуюць няшчаднай расправы над расейскімі белагвардзейцамі.

СССР сваю пазыцыю праводзіць і абараняе.

ВЕНА, 29-11. Абмяркоўваючы прапанову Мукдэнскага ўраду распачаць перамовы з Савецкім Саюзам і расцэньваючы гэтую прапанову, як капітуляцыю Мукдэну, «Вінэр Нэйстэ Нахрыхтэн» адзначае, што сіла савецкай пазыцыі ад самага пачатку канфлікту заключалася ў яго прававым пункце гледжаньня, якую ён неадступна праводзіў і абараняў. Газэта лічыць, што захоп УК чыгункі зьявіўся выразным праванарушэньнем, за якое Кітай, як відаць, запляціць паражэньнем. Вынік савецка-кітайскага канфлікту можа, на думку газэты, значна падарваць аўтарытэт Нанкінскага ўраду.

* * *

ЛЁНДАН, 29-11. Урадавы орган „Дэйлі Гэральд" піша ў перадавіцы: «Надзеі на тое, што Кітай згодзіцца на савецкія патрабаваньні, сьведчаць аб тым, што пагражаючае становішча ў Манчжурыі будзе ліквідавана. Трэба аддаць належнае савецкаму ўраду за тую вытрыманасьць, якую ён выявіў, не зважаючы на самую сур'ёзную правакацыю».

Французкі буржуазны друк аб заяве Мукдэну.

ПАРЫЖ, 28-11. Увесь французкі друк на бачным месцы зьмяшчае тэлеграму ТАСС аб згодзе Мукдэнскага ўраду распачаць перамовы на прапанаваных савецкім урадам умовах. Чырвонай піткай ва ўсіх выступленьнях у друку праходзіць пераконаньне, што ўсякае ўмешваньне дзяржаў у савецка-кітайскі канфлікт зьяўляецца зусім немагчымым.

Аднак, не зважаючы на цьвёрдыя пераконаньні ў немагчымасьці ўмяшаньня ў савецка-кітайскі канфлікт, газэты ў афіцыёзных абмеркаваньнях тэлеграмы заяўляюць: „Нельга пакінуць зусім без адказу выступленьні прадстаўнікоў Нанкінскага ўраду, бо ігнараваньне зьяўлялася-б маральным ударам на пакце Келёга".

Газэты адначасна падтрымліваюць вывад «Журналь дэ Дэба», што калі Кітай ня хоча страціць, дык ён павінен пайсьці на ўступкі ў пытаньні аб нераўнапраўных дагаворах".

Чаго будзе дамагацца нанкінскі ўрад.

ПАРЫЖ, 29-11. Французкі афіцыёзны друк лічыць, што згода Мукдэнскага ўраду на перамовы з Масквою на прапанаваных савецкім урадам умовах яшчэ не азначае адмовы нанкінскага ўраду ад далейшых зваротаў да ўдзельнікаў пакту Келёга. У гэтых выступленьнях нанкінскі ўрад будзе дамагацца ўстанаўленьня факту парушэньня Савецкім Саюзам пакту Келёга.

* * *

ТОКІЁ, 29-11. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе з Мукдэну: „На падыходзячых савецка-кітайскіх перамовах з боку Кітаю будзе ўдзельнічаць Мукдэнскі ўрад, аднак, ён будзе выступаць ад імя Нанкінскага ўраду.

Імпэрыялісты хочуць „падзарабіць".

НЬЮ-ЁРК, 29-11. Як паведамляюць з Вашынгтону, дзяржаўны дэпартамант меў нараду наконт савецка-кітайскага канфлікту з Англіяй, Японіяй і Францыяй.

Вашынгтонскі карэспандэнт газэты «Гэральд Трыбун» піша: „Дзяржавы маюць толькі адну падставу для таго, каб прымусіць СССР заключыць згоду, якая забясьпечыла-б мір у Манчжурыі. Гэтаю падставаю зьяўляецца той факт, што СССР падпісаў пакт Келёга. Лічыцца магчымым, што ў выніку такой згоды СССР адмовіцца ад УК чыгункі за ўзнагароду, гарантаваную дзяржавамі".

ПАЗШ яшчэ ня вырашылі.

НЬЮ-ЁРК, 28-11. Дзяржаўны сэкратар Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў (міністр замежных спраў Стымсон) і яго намесьнік Каткон адмовіліся адказаць карэспандэнтам газэты на запытаньне, якія крокі зробяць Злучаныя Штаты ў сувязі са становішчам у Манчжурыі.

БУНТЫ І БЯСЧЫНСТВЫ. АРМІЯ РАЗЬБЯГАЕЦЦА.

ТОКІЁ, 29-11. З Харбіну паведамляюць, што бунты і бясчынствы на заходняй лініі УК чыгункі набываюць пагрозныя разьмеры. З Хайлару рознымі шляхамі эвакуюцца адміністрацыйныя асобы, паліцэйскія чыны і іншыя прадстаўнікі ўлады. Новыя тысячы насельніцтва бяз піякага парадку, часам пешу, накіроўваюцца да Харбіну. Улада ня мае магчымасьці ліквідаваць бунт. У раёне Хайлар-Бухеду (на загаду кітайскага камандаваньня зьнішчаны галоўныя чыгуначныя пабудовы. Прычынаю зьнішчэньня была небясьпека, што гэтыя будовы могуць быць выкарыстаны і савецкімі войскам.

Бандытамі разрабаваны ўсе пасёлкі. Жыхары расстрэльвалі асоб, якія намыкаліся ўцякаць у сопкі, як „чырвоных". Вагоны паязду, якія накіроўваюцца да Харбіну, пераноўпены. На дахох вагонаў зазвычай бачыць па 50 чалавек. Ёсьць шмат выпадкаў згвалтаваньня жанчын. Па калінах валяюцца трупы жыхароў. У старым Харбіне знойдзена тры трупы кітайцаў і адзін—расейца. У Фуцьзяне ўзбунтаваны полк патрабаваў выдачы яму зброі, але да адпраўкі з гораду паразьбягаўся.

* * *

ТОКІЁ, 29-11. На ўсходняй лініі УК чыгункі здарылася крушэньне поезду. 4 вагоны разьбіты.

Нездаволенасьць гаміндану сваімі міністрамі.

ШАНХАЙ, 29-11. Кітайскі друк паведамляе, што шанхайская арганізацыя Гаміндану ўхваліла рэзалюцыю, у якой патрабуе неадкладнага звальненьня міністра замежных спраў Ван-Чжэн-Ціна і арышту Чжоу-Лун-Хуана (начальнік расейскага дэпартаманту міністэрства замежных спраў, які быў у апошні час прадстаўніком міністэрства ў Мукдэне). Шанхайская арганізацыя Гаміндану абвінавачвае Ван-Чжэн-Ціна і Чжоу-Лун-Хуана ў тым, што яны не здольны вырашыць савецка-кітайскага канфлікту, у выніку чаго Манчжурыі ўчынены нязьлічоныя страты.

Водлуг паведамленьня „Шун-Бао", гаміндаўскія колы ў Пэйпіне і Цінцьзіне, а таксама па ўсёй Манчжурыі абвінавачваюць нанкінскіх дыплёматаў у неадпаведнасьці свайму назначэньню.

Ліга Нацый можа стаць у няпрыемнае становішча.

БЭРЛІН, 27-11. Ліга Нацый да гэтага часу яшчэ не атрымала заявы Нанкінскага ўраду наконт савецка-кітайскага канфлікту. У жэнеўскіх колах баяцца, што ўмешваньне Лігі ў савецка-кітайскі канфлікт можа паставіць Лігу ў вельмі няпрыемнае становішча.

* * *

БЭРЛІН, 28-11. Увесь друк падкрэсьлівае, што Нанкінскі ўрад да ўчарашняга вечара не паслаў ніякай заявы да Лігі Нацый, не зважаючы на папярэднія паведамленьні.

Мітынг у чэсьць Далёка-Усходняй.

БЭРЛІН, 29-11. Сёньня ў Бэрліне адбыўся вялікі мітынг у сувязі з паражэньнем кітайскіх імпэрыялістаў-захопнікаў УК чыгункі. На мітынгу выступалі прадстаўнікі нямецкай кампартыі Гэрнц Пэйман і кітайскія камуністы.

Нарада Гендэрсона з Дауэсам.

ЛЁНДАН, 29-11. Учора ў міністэрстве замежных спраў адбылася нарада між Гендэрсонам і амэрыканскім паслом у Лёндане Дауэсам наконт становішча на савецка-кітайскай мяжы.

У Саюзе ССР.

Не паслабляць барацьбы з правым апартунізмам.

ЛЕНІНГРАД, 29-11. На дакладу т. Кірава аб выніках пленуму ЦК трохтысячная армія камунараў „Красного Путиловца" аднагалосна ўхваліла рэзалюцыю, у якой заяўляецца, што ў будучым неабходна праводзіць непаслабную барацьбу з правым апартунізмам, з прычыны таго, што ідэалёгія правых будзе яшчэ доўга зьяўляцца перашкодаю ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Сход са здаволеньнем зазначае, што настойлівасьць ЦК у праводзеньні лініі партыі выклікала поўнае банкроцтва правай групоўкі ў партыі і прымусіла правадыроў правай апазіцыі прызнаць свае памылкі, ад якіх яны не адмаўляліся паўтары гады.

Пленум калектыву прапануе на другім годзе пяцігодкі паставіць працу на заводзе так, каб значна перавысіць дадзеную заводу праграму, асабліва па трактарабудаўніцтву. Пленум абавязаў усіх партыйцаў і камсамольцаў уступіць ва ўдарныя брыгады.

Пленум паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і т. Сталіну.

Такая-ж рэзалюцыя ўхвалена на пленуме партарганізацыі заводу „Бальшавік".

Скаргі па самаабкладаньні не падлягаюць аплаце гэрбавым зборам.

МАСКВА, 29-XI. Наркамфін СССР растлумачыў, што ўсе скаргі на самаабкладаньні, якія падаюцца ў сельскія саветы, аплаце гербавымі зборамі не падлягаюць. Скаргі па самаабкладаньні, якія падаюцца ў акрвыканкомы і фінансавыя органы гаспадаркамі, абкладзенымі с.-г. падаткам у індывідуальным парадку, і асобнымі грамадзянамі, абкладзенымі прыбытковым падаткам, аплачваюцца гербавым зборам на агульных падставах.

Скаргі па самаабкладаньні ўсіх іншых катэгорый гаспадарак і грамадзян (у тым ліку рабочых і служачых) ад гербавага збору вызваляюцца.

Абнаглеўшы фашызм ня здолее стрымаць рэвалюцыйную хвалю.

Тысячы пралетарыяў выступілі ў абарону „Юманітэ".

НАРЫЖ, 29-11. Праўленьне рабоча-сялянскага банку сёньня агаласіла новую дэклярацыю за подпісам дырэктара і 12-ці сяброў праўленьня, у якой заяўляе, што праўленьне разам з пралетарскімі арганізацыямі Францыі ня дасьць выкарыстаць банк дзеля прыдушэньня «Юманітэ». Праўленьне падцьвярджае, што запазычанасьць «Юманітэ» складае ў сучасны момант толькі 1146000 франкаў. Зборы на карысьць «Юманітэ» прадаўжаюцца з непаслабным посьпехам і на сёньнешні дзень дасягнулі ўжо 1055000 франкаў.

4-ты раён парыскай арганізацыі кампартыі выклікаў на рэвалюцыйнае спаборніцтва ўсе іншыя раёны парыскай арганізацыі, абавязуючыся сабраць да канца году 10 тысяч франкаў, стварыць 10 новых камітэтаў на абарону „Юманітэ" па прадпрыёмствах і максымальна пашырыць сетку рабкораў. Адлічэньні прафсыянальных арганізацый на карысьць «Юманітэ» на сёньнешні дзень перавысілі 90 тысяч франкаў. Буржуазныя газэты прадаўжаюць праводзіць паклёпніцкую кампанію супроць „Юманітэ" і патрабуюць рашучых захадаў у адносінах да газэты ў выпадку нявыплаты ўсяго доўгу да канца месяца.

Узброеная сутычка сялян з паліцыяй.

ТОКІЁ, 28-11. 26-га лістапада ў прэфэктуры Акіта здарылася ўзброеная сутычка між 150-цю сялянамі і паліцэйскімі, якія спрабавалі арыштаваць лідэра мясцовага аддзяленьня сялянскай арганізацыі „Зенкоку-Номі-Куміай" Огасавара. Сяляне далі ўзброены адпор паліцэйскім. У сутычцы ўдзельнічалі нават жанчыны і дзеці. Ёсьць шмат параненых.

Спроба арыштаваць Огасавара была выклікана адмоваю сялян, якімі кіруе «Зенкоку-Номі-Куміай» падпачаліцца пастанове вярхоўнага суду, які вырашыў адну зямельную спрэчку, што цягнулася 5 гадоў, не на карысьць сялян. Пасьля сутычкі між мясцоваю ўладаю і сялянамі распачаліся перамовы, якія скончыліся ўвечары замірэньнем, пасьля чаго сяляне разышліся.

Здраднікі сьвяткуюць „перамогу".

ПАРЫЖ, 28-11. 2 з паловаю тысячы суднабудаўнічых рабочых на верфях у Сэн-Назары, якія 3 месяцы баставалі пад кіраўніцтвам рэфармісцкага прафсаюзу, распачалі сёньня працу на ранейшых умовах. Забастоўка была сарвана рэфармістамі, якія ўгаварылі бастуючых рабочых здаволіцца абяцанкамі прэфэкта заступіцца за іх перад дырэктарамі вэрфяў.

Сацыял-фашысцкія газэты, не зважаючы на яўнае паражэньне забастоўкі, не саромяцца гаварыць пра яе „перамогу".

Перамога рэвалюцыйнага крыла.

БЭРЛІН, 28-11. Па перавыбарах праўленьня аддзелу рэфармісцкага прафсаюзу гарнякоў у Ган-Эт'ене (Рурская вобласьць) перамог сьпіс рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў, не зважаючы на ўзмоцненую агітацыю рэфармісцкіх праффбюракратаў.

Усенямецкі зьезд левых прафсаюзаў.

БЭРЛІН, 29-11. Заўтра ў Бэрліне адчыняецца першы ўсенямецкі зьезд левых апазіцыйных прафсаюзаў. У сувязі з адчыненьнем зьезду заўтра ўвечары адбудзецца дэманстрацыя бэрлінскіх рабочых.

Аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту за 1927-28 год.

Даклад т. Буніна на II Сэсіі ЦВК БССР.

Гаспадарчыя посьпехі 1927-28 г.

Дзяржаўны бюджэт БССР на 1927-28 г. быў зацьверджаны 2-й Сэсіяй ЦВК па прыбытках у суме 47.000,4 т. р., па выдатках 63.649,6 т. р. Такім чынам прадбачыўся дэфіцыт на суму 16.649,2 т. р.

Трэцяй Сэсіяй ЦВК Саюзу IV скліканьня наш бюджэт быў зацьверджан па даходах і выдатках у суме 58.663.500 р., прычым даходная частка бюджэту складалася з уласных рэспубліканскіх даходаў у суме 48.902 т. р., з адлічэньняў ад агульна-саюзных паступленьняў 7.600 т. р. і на пакрыцьцё дэфіцыту 2.161 т. р.

Асноўнымі задачамі ў 1927-28 г. зьяўляліся пашырэньне і ўзмацненьне сацыялістычных форм гаспадаркі, разьвіцьцё працэсаў аграмаджаньня, ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па рашучай індустрыялізацыі БССР, шляхам новага прамысловага будаўніцтва і падвышэньня ўдзельнай вагі прамысловасьці ў прадукцыі народнай гаспадаркі БССР; уздым сельскай гаспадаркі на больш вышэйшую ступень разьвіцьця праз калектывізацыю і аказаньне належнай дапамогі бядняцка-серадняцкім колам сялянства, далейшае разьвіцьцё культурнага будаўніцтва, паляпшаньне дабрабыту працоўнага насельніцтва.

Калі мы возьмем шэраг асноўных паказчыкаў разьвіцьця народнай гаспадаркі ў іх колькасным выразе, то мы будзем мець, што прадукцыя сельскай гаспадаркі у 1927-28 г. дала ўзрост у 6,6 проц. супроць зьніжэньня ў мінулым годзе на 2,4 проц. Прадукцыя прамысловасьці дала ўзрост на 20,9 проц. супроць 16,9 пр. на пляну. Сабекошт у прамысловасьці панізіўся на 6,75 проц. супроць падвышэньня на 3,9 проц. у папярэднім годзе. Таваразварот узрос на 19,3 проц. супроць плянавых меркаваньняў у 10,6 пр.

Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць за 2 гады ўзрасьлі больш чым у два разы.

Колькасьць асоб, занятых у прамысловасьці, у адносінах да ўсяго занятага насельніцтва складала 3,3 проц., у справаздачным годзе супроць 2,6 проц. у 1925-26 г. Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці ў адносіне да ўсёй прадукцыі народнай гаспадаркі складала 23,3 проц. супроць 19,4 проц. за 1925-26 г.

Усе гэтыя паказчыкі сьведчаць аб тым, што цэнтральныя задачы гаспадарчай палітыкі—індустрыялізацыя краіны, пашырэньне і ўзмацненьне сацыялістычных форм гаспадаркі.

Па пляну на 1927-28 г. прадбачылася магчымасьць канцэнтрацыі ў аграмаджаным сэктары 23,5 проц. усёй прадукцыі. Фактычна было дасягнута 25,7 проц. У агульным таваразвароце ўдзельная вага абагуленай часткі дзяржаўнага і каапэрацыйнага гандлю фактычна складала 84,3 проц. супроць плянавых меркаваньняў у 72,7 проц. У дробным гандлю ўдзельная вага прыватніка складала толькі 29,6 проц супроць 42,2 на пляну.

Як бюджэт спрыяў выкананьню задач сацыялістычнага будаўніцтва.

У якой ступені бюджэт садзейнічаў паказаным працэсам разьвіцьця гаспадаркі? Трэба адзначыць, што вызначаны на 1927-28 г. дзяржаўны бюджэт быў выкананы з некаторым перавышэньнем на 5,9 проц. Агульная характарыстыка даходнай часткі бюджэту 1927-28 г. можа быць дана наступная: У большай сваёй частцы даходы дзяржаўнага бюджэту залежылі ад непадатковых даходаў, г. зн. ад даходаў аграмаджанай часткі народнай гаспадаркі. Каля 80 проц. гэтых даходаў складаў даход па лясной гаспадарцы.

Другое месца займала падатковая частка даходаў. Выконваючы падатковую частку бюджэтных даходаў фактычна зусім выразна праводзілася лінія на тое, каб ахапіць больш поўна і абкласьці больш высока даходы заможных груп насельніцтва вёскі і непрацоўнай часткі гарадзкога насельніцтва. У той-жа час быў праведзены цэлы шэраг мерапрыемстваў па зьніжэньню падаткаў бяднейшаму насельніцтву. Ужываўся шэраг палёгкаў пры абкладаньні серадняцкіх мас вёскі, дзяржаўных і каапэрацыйных прадпрыемств гораду.

Правядзеньне с-г. падатку грунтавалася на законе 1926-27 г., які, як вядома, каранным чынам зьмяніў існаваўшую раней сыстэму абкладаньня с.-г. падаткам у бок прыцягненьня да абкладаньня другарадных крыніц земляробчых даходаў і неземляробчых заработкаў, павялічэньня ставак падатку для гаспадарак з павялічанымі даходамі, памяншэньне для гаспадарак з невялікім даходам і поўнага аслабаненьня ад падатку бядняцкіх гаспадарак у разьмеры 25 процантаў усіх гаспадарак.

У гэты закон былі ўведзены толькі некаторыя папраўкі, якія мелі сваёй мэтай выправіць выявіўшыяся ў 1926-27 г. недахопы і устанавіць спэцыяльны скідачны фонд для маламоцных і неплацежаздольных гаспадарак, а таксама для заахвочваньня паасобных галін гаспадаркі.

Трэба падкрэсьліць, што ўсяго ў 1927-28 г. было вызвалена ад с-г. падатку 39,3 проц. усяго сялянства, з якіх 24,2 проц. было поўнасьцю вызвалена, а 15 проц. часткова. Акрамя таго былі даны ільготы сем'ям чырвонаармейцаў і г. д. усяго на суму 2.750.000 руб.

Правядзеньне падаходнага падатку грунтавалася на наступных падставах:

Была спрошчана сыстэма спагнаньня падаходнага падатку з рабочых і служачых і былі паніжаны для іх стаўкі абкладаньня;

Былі павялічаны стаўкі для платнікаў з росьпісу—асоб з непрацоўнымі даходамі, а таксама апошнія былі пазбаўлены ільгот па сямейнаму становішчу ў той час, як для платнікаў першых двух росьпісаў гэтыя ільготы былі пашыраны.

Падатковая сыстэма ў Беларусі далкам адпавядала агульнаму напрамку эканамічнай палітыкі — барацьба з капіталістычнай часткай гораду і вёскі, садзейнічаньне і дапамога бядняцка-серадняцкім групам насельніцтва, сыстэма абкладаньня капіталістычных элемэнтаў гораду таксама садзейнічала правядзеньню палітыкі на выціскаьню прыватніка. Цікава адзначыць, што пазачынялася надзвычайна шмат прыватных прадпрыемстваў. І зачыняліся галоўным чынам буйныя прадпрыемствы. Па 6-му разраду, гэта самы буйны разрад, зачынілася 91 проц., 5-га разраду—79 проц., 4-га разраду 56 і г. д. Якім чынам бюджэт разьмяркоўваў свой даход і ці адпавядаў напрамак сродкаў па бюджэту агульнаму заданьню па разьвіцьцю народнае гаспадаркі? На гэта пытаньне можна адказаць наступнымі параўначымі лічбамі:

На мерапрыемствы па фінансаваньню народнае гаспадаркі ў 1927-28 г. было асыгнавана 19.600 т. р. замест 13.600 т. р. у мінулым годзе. На сацыяльна-культурныя патрэбы замест 11.600 т. р. у мінулым годзе было ў 1927-28 г. асыгнавана 14.800 т. р. Адлічэньні мясцовага бюджэту замест 19.443 т. р. у 26-27 г. склалі 23,237 т. р. а на дзяржаўнае кіраўніцтва было выдаткавана 4.600 т. р. у мінулым годзе, а зараз 4.299 т. р. і іх удзельная вага з 9,3 проц. зьменшылася да 6,9 проц. Гэта гаворыць аб тым, што асноўныя сродкі былі асыгнаваны на чыста вытворчыя патрэбы.

Бюджэтныя выдаткі на капітальнае будаўніцтва прамысловасьці склалі 5882 т. р., што адносна да агульнай сумы капітальных затрат па прамысловасьці ВСНГ складала 35 проц. Матар'яльныя выніхі капітальнага будаўніцтва заключаюцца ў тым, што за апошні год склад прамысловых прадпрыёмстваў абнавіўся шэрагам уноўпабудаваных прадпрыёмстваў.

Калі мы возьмем якасныя паказчыкі, то ўбачым, што ўздым вытворчасьці працы ў 1927-28 годзе быў на 16,3 проц., у 28-29 г. на 24,3 проц., супроць 6,6 у 1926-27 г.

Зьніжэньне сабекошту, я аб гэтым ужо гаварыў, на 6,75 проц. у 1927-28 г. і прыблізна каля 5 проц. у 1928-29 г., у той час, калі ў 1926-27 г. мелі ўзрост сабекошту на 3,9 проц; узрост валавой прадукцыі прамысловасьці на 25,7 проц., у 1928-29 г. на 48 проц. супроць тэмпу 1926-27 г. на 14,6 проц. Усё гэта зьяўляецца вынікам палярэдніх капітальных укладаньняў у прамысловасьць, сярод якіх бюджэтныя асыгнаваньні займалі досыць значнае месца. Эфэкт капітальных укладаньняў у прамысловасьць таксама відавочна з чыста бюджэтных разрахункаў. Мы маем таксама шэраг дасягненьняў у галіне сельскай гаспадаркі.

Калі мы возьмем будаўніцтва за справаздачны год, то трэба будзе адзначыць, што ў гэтым годзе мы скончылі будаўніцтва Дому Селяніна, прыступілі да будаўніцтва Унівэрсытэцкага Гарадка і цэлага шэрагу інш.

За кошт групы сацыяльна-культурных выдаткаў дзяржбюджэт на працягу справаздачнага году ўтрымліваў значную сетку навучальных і лекавых устаноў. Але неабходна адзначыць, што пры выдатканьні сродкаў па дзяржбюджэце меліся адмоўныя моманты, меўся цэлы шэраг недахопаў. Падрабязна гэтыя недахопы адзначаюцца ў надрукаванай справаздачы, я спыняюся толькі на некаторых.

Калі мы возьмем прамысловасьць, то пры агульнай каштоўнасьці затрат па ўсіх трэстах, якія намі былі абсьледваны, у 12400000 р., звыш-плянавыя затраты складалі 2370000 р. ці 19,1 проц. і недавыканана работ на 2363000 руб.

Недахопы будаўніцтва справаздачнага году.

Будаўніцы сэзон застаў большасьць гаспадарчых органаў непадрыхтаванымі да выкананьня будаўнічай праграмы. Праэкты, каштарысы якія былі не заўсёды рэальнымі, у некаторых выпадках яны прадугледжвалі работу, ня ўлічваючы сапраўднага яе разьмеру.

Прамфінплян быў зацьверджаны праз 7 м-цаў пасьля пачатку гаспадарчага году.

Пляны работ па землеўпарадкаваньню ня выкананы: замест 660 тыс. гэктараў, якія былі намечаны па кантрольных лічбах, плян быў зьніжан да 548 т. гэкт., а выканана ўсяго 472 тыс. ці 87,9 проц. ранейшага пляну. З выкананых земляўпарадкаваўчых работ былі створаны хутарскія гаспадаркі ў 14,7 проц. да агульнага ліку ўпарадкаваных гаспадарак з плошчаю ў разьмеры 42 т. гэкт. ці 18,7 пр. агульнай земляўпарадкаванай плошчы. У той-жа час, ня гледзячы на дырэктывы ўраду аб земляўпарадкаваньні ў справаздачным годзе ўсіх калгасаў, да канца году засталося неўпарадкаванымі 102 з ліку арганізаваных на працягу 1927-28 г. і 3 калгасы з ліку існаваўшых да пачатку справаздачнага году.

Пры скарыстаньні с-г. крэдыту мела месца недастаткова плянавасьць у разьмеркаваньні сродкаў, у выніку чаго патрэбныя сродкі для гэтай справы ў значных сумах засталіся ў вышэйшых зьвенях крэдытнай сыстэмы. Меліся, праўда, адзіночныя выпадкі крэдытаваньня зусім ня тых, каго трэба: млынароў саматужнікаў, заможных гаспадарак, а таксама скарыстаньне сродкаў па фонду крэдытаваньня самімі крэдытнымі таварыствамі на свае гандлёвыя апэрацыі.

Усе гэтыя, а таксама і іншыя выпадкі парушэньнаў, якія наглядаліся з боку паасобных устаноў пры выкананьні дзяржаўнага бюджэту, выклікалі адпаведнае рэагаваньне з боку фінансавага кантролю: пастаноўку пытаньняў перад вышэйшымі ўдарнымі органамі, прыцягненьне да судовай адказнасьці. Але памянёныя выпадкі паасобных недахопаў не мяняюць агульных вынікаў бюджэту 1927-28 г. Бюджэт быў выканан у поўнай адпаведнасьці з запатрабаваньнямі разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР.

Пры гэтым па выдатках, як ужо я гаварыў і па прыбытках бюджэт быў выкананы з правышэньнем: замест 56 мільёнаў 502.200 руб. прыбытку наступіла 59.820.400 руб. ці 105,9 проц.

Замест 58 міл. 663.500 руб. выдаткаў выдаткавана 62.106.300 руб., ці 105,8 проц.

1927-28 гаспадарчы год быў годам пералому.

Заканчваючы свой даклад, я лічу неабходным падкрэсьліць яшчэ і тое, што 1927-28 г. для нашай работы мае вялікае значэньне—мае таму, што гэты год зьяўляецца базісным годам для нашай пяцігодкі, і ад таго, як мы выканалі нашыя пляны і нашы меркаваньні у гэтым годзе, у значнай ступені, у значнай меры залежылі тыя тэмпы, якія мы ўзялі для нашай пяцігодкі. І трэба сказаць, што гэты 1927-28 г. быў годам, дзе вызначыўся пералом у нашай працы да буйнага ўзросту ўсёй народнай гаспадаркі, сьведкамі чаго мы ўжо зьяўляемся.

У справаздачным 1927-28 годзе мы мелі бюджэт яшчэ толькі ў 58 міл. руб., а сёньня мы ўжо зацьвярджаем бюджэт на 1929-30 г. у 145—146 міл. руб.: за 2 гады наш бюджэт вырас больш як у 2 разы. Такім самым чынам мы расьцём і па іншых галінах. Пры гэткіх вялікіх напружаных тэмпах нашай работы, чоткасьць арганізацыі набывае вялікае значэньне.

Нам трэба зьнішчыць усе тыя недахопы, якія мы мелі ў справаздачным годзе, абвясьціць барацьбу бясплянавасьці, неэканомнаму выдаткаваньню сродкаў і г. д. Мы павінны захоўваць максымальную эканомію дзеля таго, каб мы маглі яшчэ больш шпаркім тэмпам будаваць сацыялізм, каб мы маглі ўсе тыя капейкі, рублі і тысячы, якія з'эканомім, кінуць у наша сацыялістычнае будаўніцтва, каб мы маглі нашыя пляны, у прыватнасьці пяцігадовы плян, выканаць у максымальна-кароткі тэрмін.

Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б і Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту БССР.

Першы Зьезд 19 буйных калгасаў Дамаканаіцкага і Лапаўскага сельсаветаў Калінкавіцкага раёну, сапраўдных арганізацыі куставога аб'яднаньня, шле сваё шчырае прывітаньне Ленінскаму ЦК і вышэйшай уладзе БССР—ЦВК.

Зьезд запэўняе, што ўскладзеныя задачы Партыяй у справе выкананьня пяцігадовага пляну разьвіцьця нашай гаспадаркі і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на калектывізацыі, у саюзе рабочай клясы з батрацтвам і серадняцкай масай сялянства, пад кіраўніцтвам Ленінскай Камуністычнай Партыі будуць выкананы.

Усім ворагам, кулакам на вёсцы, нэпману ў горадзе жывацелю на вытворчасьці дадзім рашучы адпор яшчэ узмацнім барацьбу з варожымі элемэнтамі, якія шкодзяць каму росту пабудовы сацыялізму.

Зьезд папэўняе ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР, што ўсе сілы бы замежнай своры, якія імкнуцца сар аць сацыялістычнае будаўніцтва, сустрэне рашучы пралетарскі адпор.

Грудзьмі адстаім заваёвы Вялікага Кастрычніка.

Няхай жыве Ленінскі ЦК КП(б)Б—кіраўнік сацыялізму будаўніцтва.

Няхай жыве ЦВК БССР—Вышэйшая Улада працоўных Беларусі.

Няхай жыве цесны саюз рабочае клясы з працоўным сялянствам.

Няхай жыве калгаснае будаўніцтва.

Прэзыдыум Зьезду.

26-XI-29 г. в. Халоднікі, Мазырскай акругі.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

Пра скліканьне ўсебеларускага зьезду па дасьледчай справе.

СНК зацьвердзіў Арганізацыйны Камітэт па скліканьні ўсебеларускага зьезду па дасьледчай справе з наступных таварышоў: Рачыцкі (Старшыня Камітэту), Платун, Пінчук, Будзіаскі, Міцькоў, Гаўрэцкі, Вінэр, Дубах, Мельнік, Пратасеня, Журык, Аляксееў, Вайтэнкаў, Крывіцкі, Пятровіч, Сьмірноў, Мікалаеў, Талапіла і Каплан.

Павестка дня гэтага зьезду прынята наступная: 1) Калектывізацыя сельскай гаспадаркі. 2) Пэрспэктывы разьвіцьця дасьледчай справы ў БССР у зьвязку з калектывізацыяй. 3) Вынікі дасьледчай справы. 4) Праблемы мэханізацыі ў БССР. 5) Праблемы мэханізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі БССР. 6) Праблемы лясной дасьледчай справы. 7) Праблемы жывёлагадоўлі і кармавая база. 8) Задачы аддзелаў прыстасаваньня ў зьвязку з калектывізацыяй і 9) падрыхтоўка кадраў.

Пра падрыхтоўку шофэраў.

СНК прызнаў неабходным безадкладна павялічыць асыгнаваньні на аўта-шофэрскія курсы ад 100 да 300 чалавек. Грамадзкія арганізацыі могуць праявіць сваю ініцыятыву ў справе водпуску сродкаў на дадатковую арганізацыю курсаў аўта-шофэраў.

Пра выяўленьне ў г. Бабруйску саляных вод.

СНК заслухаў інфармацыю Камітэту па хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР аб выяўленьні ў г. Бабруйску саляных вод. Гэтая салёная вада выяўлена ў адным з водаправодных шчылін. У зьвязку з тым, што вада з гэтай шчыліны па свайму хэмічнаму складу, паводле паведамленьня Камітэту па хэмізацыі, зьяўляецца цікавай як з боку больнялёчнага, так і гэолёгічнага, СНК даручыў Бабруйскаму АВК ужыць захады да часовага захаваньня шчыліны ў сучасным яе становішчы і праводзіць у далейшым працу па ўзгадненьні з Геалёгічным Інстытутам Беларускай Акадэміі Навук. Гэалёгічнаму Інстытуту запрапанава распачаць безадкладна ўссбаковае вывучэньне і дасьледваньне гэтай шчыліны, прыцягнуўшы да гэтай працы Санітарна-Гігіенічны Інстытут НК Аховы Здароўя. СНК прызнаў неабходным, каб усе сьвідравальныя работы на тэрыторыі БССР рабіліся пры наглядзе Гэолёгічнага Інстытуту Беларускай Акадэміі Навук для навукова-вывучэньня.

Дэлегацыя лётчыкаў у СНК.

Савет Народных Камісараў наведала дэлегацыя лётчыкаў №-ай авіацыйнай брыгады, якая на пазачарговым пасяджэньні СНК ад імя лётчыкаў, чырвонаармейцаў, камандна-палітычнага складу брыгады перадала прывітаньне свайму шэфу—Савету Народных Камісараў БССР і ў адзнаку неразрыўнай спайкі і дружбы з працоўнымі Беларусі перадала СНК прывітальную грамату і мадэль самалёту „Краіна Саветаў".

Выступаўшыя з прывітаньнем дэлегаты адзначалі тыя дасягненьні, якія мае брыгада за апошні час. Для ажыцьцяўленьня ўскладзеных на брыгаду задач быў заключаны з другой эскадрыльлю дагавор сацыялістычнага спаборніцтва, які ўжо амаль цалкам выкананы. Авіацыйная брыгада, зазначалі выступаўшыя, апроч працы па ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны праводзіць таксама працу сярод шырокіх працоўных мас, працуючы па, хлебазагатоўках, па перавыбарах саветаў і г. д. У выніку манэўраў брыгада выканала ўсе тыя заданьні, якія былі ўскладзены на яе і выйшла аднэй з першых у параўнаньні з іншымі эскадрыльлямі. Брыгада атрымала першы прыз Асоавіахіму па БВА. Выступаўшыя запэўнілі СНК што ўсе тыя задачы, якія будуць на іх ускладзены, яны і ў далейшым будуць таксама цалкам выконваць.

З прывітаньнем ад імя маладых чырвонаармейцаў брыгады выступіў чырвонаармеец тав. Грынберг, які зазначыў, што Рабоча-Сялянская Чырвоная армія навучыла пазнаваць ня толькі свайго знадворнага ворага, але таксама навучыла пазнаваць і свайго ўнутранога ворага, таго, хто перашкаджае будаваць сацыялізм. Мы з уважлівасьцю, гаворыць ён, сачылі за тым, каб у нашу Рабоча-Сялянскую Чырвоную армію не трапілі савы вораг. Мы цьвёрда стаяць на сваім пасту. Рабоча-Сялянская Чырвоная армія зьяўляецца сапраўдным арміяй і мы, гаворыць тав. Грынберг, апроч тэй зброі, якую нам дае рыялізм, узброены новай зброяй — завецца Ленінізмам і з гэтай зброяй заўсёды будзем гатовы супроць нашых ворагаў.

Перадаючы прывітальныя мадэль самалёту „Краіна Саветаў" пралятаўшы з Масквы дэлегаты адзначылі, што самалёт „Краіна Саветаў" пралятаўшы з Масквы на Іорк паказаў усяму сьвету магутнасьць і сілу нашага ваеннага флёту. Мы абмацалі дэлегаты, посьпехі экіпажу „Краіна Саветаў" у брыгадзе цалкам. Асабліва склад брыгады тав. Ваўкаў свайму шэфу—Савету Народных Камісараў і ўсім працоўным БССР. Мы ўсю хвіліну ўсёй брыгадзе нашу баявой гатоўнасьці і пакажем Савету Народных Камісараў адкладна ўступіць у бой з ворагамі для абароны Савецкай дзяржавы. Мы выказваем, заявілі ён, поўную ўпэўненасьць, што наш арганізатар і кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, павядзе калёны рабочых і сялян шляху далейшага пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, па індустрыялізацыі і суцэльнай калектывізацыі і сацыяльнай Савецкай Беларусі на грунце нашай барацьбы з капіталістамі і тымі, хто перашкаджае барацьбе.

Адказваючы на прывітаньні лётчыкаў, Старшыня СНК зазначыў, што ўсе тыя пасьпехі, якія мае брыгада, вялізарным посьпехам у справе выкананьня абароназдольнасьці брыгады ў той штодзённай будовай сацыялізму ў краіне, якую праводзяць грамадзянскія, заслугоўвае асаблівае ўвагі, што мы маем Рабоча-Сялянскую Чырвоную армію тых задач, якія на яе ўскладзены ў галіне абароны краіны, апроч тых задач, якія на яе ў галіне абароны краіны, аканчэнне і ў правядзеньні сацыялістычнага будаўніцтва. Мадэль самалёту, якую ваенна-служачыя брыгады БССР, гаворыць тав. Галаднік, аб тым вялізарным творчым працоўна-сялянскіх мас, якія і ў сёньняшнім, як на заводах і фабрыках, ствараюць вялізарную энэргію і што магло і можа праявіцца ў ўмовах дыктатуры пралетарыяту, сьведчыць аб тым, што ў шырокіх працоўных мас ёсьць энэргія, якая рэзэрвы творчай ініцыятывы, што служаць залогам далейшым сацыялістычным ударам Урад БССР, гаворыць т. Галаднік, з другога боку зробіць усё для таго, каб лепшыць умовы працы для нашай творчай думкі, для абароназдольнасьці краіны.

Тав. Галадзед, ад імя Урада, адказаў №-ай авіацыйнай брыгадзе, якую надзею і ўпэўненасьць ён, сувязь, якая зараз існуе паміж арміяй і рабочаю клясаю, будзе ўзмацняцца і што мы агульнымі зможам дабіцца ўзмацнення здольнасьці краіны, што дасягнем цалкам і поўнасьцю сацыялізм.

* * *

У дні Кастрычнікавых сьвят сход ваенна-служачых №-й брыгады сумесна з рабочымі „Чырвоны Мэталіст" пастанавіў перад РВС СССР аб залічэньні СНК тав. Галадзеда гаўтатэхнікам брыгады.

* * *

Прывітальная грамата і мадэль „Краіна Саветаў" пастаўлены пасяджэньняў СНК.

Да перазаключэньня калектыўных дагавароў.

Канчаецца тэрмін дзеяньня калектыўных дагавароў, якія заключаны прафсаюзамі з гаспадарчымі органамі ў сьнежні месяцы 1928 г. Час, які застаўся да скančэньня тэрміну дзеяньня старых дагавароў, неабходна скарыстаць для праверкі ступені іх выкананьня і шырокага абгаварэньня новых дагавароў.

Надыходзячае перазаключэньне калектыўных дагавароў зьяўляецца важнейшай палітычнай кампаніяй.

Яна будзе праходзіць у абставінах росту сацыялістычнага будаўніцтва, рашучай сацыяльна-тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, у абставінах узмоцненага выцясьненьня капіталістычных элемэнтаў і абастрэньня клясавай барацьбы ў краіне. Яна будзе праходзіць у шчыльнай сувязі з праверкай і перазаключэньнем дагавароў па сацыялістычнаму спаборніцтву і абгаварэньнем вынікаў работы прадпрыемстваў за мінулы год і пэрспэктыў на 1929-30 гаспадарчы год. Гэтыя кампаніі павінны быць поўнасьцю падпарадкаваны ажыцьцяўленьню лёзунга „Прафсаюзы, бліжэй да вытворчасьці".

Мінулы 1928-29 гаспадарчы год—першы год пяцігодкі цалкам і поўнасьцю сьцьвердзіў правільнасьць генэральнай лініі партыі і рашуча адхіліў погляды правых апартуністаў аб неабходнасьці зьмяншэньня тэмпу індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Жыцьцё бязьлітасна адкінула хвасьцікую ўстаноўку і палахлівыя перасьцярогі прадстаўнікоў правага ўхілу, іх прароцтвы аб няўхільным зьмяншэньні намечаных тэмпаў індустрыялізацыі. Яно паказала нашай партыі і рабочай клясе на неабходнасьць яшчэ большага паскораньня тэмпаў будаўніцтва і скарочаньня тэмпаў для выкананьня пяцігадовага пляну. Плянавыя меркаваньні на надышоўшы 1929-30 гаспадарчы год адлюстроўваюць гэтыя ўладарныя патрабаваньні жыцьця і зьяўляюцца доказам вялізарнейшых магчымасьцяй далейшага росту.

Упэўненыя ў магчымасьці выкананьня намечанага пляну і ў магчымасьці далейшага скарочаньня тэрміну ажыцьцяўленьня пяцігодкі, партыйныя, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі і ўся рабочая кляса павінны з яшчэ большай увагай і жорсткімі патрабаваньнямі падыйсьці да палепшаньня якасьці ўсёй нашай гаспадарчай працы.

Выкананьне і перавыкананьне праграмных заданьняў на далейшаму разьвіцьцю прамысловасьці шчыльна зьвязана з вырашэньнем пытаньняў аб уздыме матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочых, палепшаньнем іх быту і ўмоў працы. Таму ў бягучую калдагаворную кампанію перад прафсаюзамі і гаспадарчымі органамі стаіць адказьнейшая задача па далейшаму палепшаньню матар'яльнага і бытавога становішча рабочых і служачых. Трэба дамагчыся поўнага ажыцьцяўленьня намечанага росту намінальнага і рэальнага заработку і падвышэньня жыцьцёнага ўзроўню рабочых. Дамагчыся лепшых умоў быту і працы праз своечасовае і правільнае выдаткаваньне асыгнуемых сродкаў на ахову працы, на жыльлёвае будаўніцтва і пашырэньне сеткі бытавых устаноў і культурнае абслугоўваньне рабочых.

Кантрольныя лічбы на 1929-30 год аддаюць значную ўвагу і месца пытаньням росту заработку і палепшаньню ўмоў працы і быту рабочых. Рэальны заработак прамысловых рабочых павінен павялічыцца на 13—14 проц., пры росьце намінальнага—9 пр. па саюзнай і рэспубліканскай прамысловасьці. Выдаткі на ахову працы павялічваюцца з 54 мільёнаў да 80 мільёнаў рублёў на жыльлёвае будаўніцтва па грамадзкаму сэктару (бюджэтныя асыгнаваньні, ФУБР, каапэрацыйнае будаўніцтва, банкаўскія крэдыты і выдаткі прамысловасьці і транспарту) намечана выдаткаваць 672 мільёны замест 432 мільёнаў руб., выдаткаваных у мінулым годзе. Намечан вялікі рост выдаткаў па бюджэту на сацыяльна-культурнае абслугоўваньне, які ў надышоўшым годзе дае 545 мільёнаў руб.

Такім чынам, асноўныя паказчыкі кантрольных лічбаў 1929-30 г. намячаюць вялізарныя посьпехі ня толькі ў разьвіцьці народнай гаспадаркі, але і ў падвышэньні матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочых мас, у стварэньні лепшых умоў працы і быту. Толькі на падставе рашучай перабудовы форм і мэтадаў усёй нашай нізавой — партыйнай, гаспадарчай і прафсаюзнай работы ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі рэканструкцыйнага пэрыяду мы выканаем нашу праграму сацыялістычнага будаўніцтва.

Цэнтральная ўвага парт'ячэек, фабзавмясцкомаў і ўсяго партыйнага і прафэсыянальнага актыву прадпрыёмстваў пры абмеркаваньні калдагавароў (на сходах рабочых і служачых, у працы клюбаў, чырвоных куткоў, бібліятэк, насьценных газэт, радыёвяшчаній і прафпалітшкол) павінна быць згуртавана на мабілізацыі грамадзкай думкі членаў саюзу вакол пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва і практычнага ўдзелу іх у ажыцьцяўленьні пяцігадовага пляну і кантрольных лічбаў на 1929-30 год.

Ворагі рабочае клясы бязумоўна паспрабуюць выкарыстаць цяжкасьці нашага будаўніцтва. Праз сваіх агентаў на прадпрыемствах яны могуць пашкодзіць правядзеньню генэральнай лініі гаспадарчага будаўніцтва. Яны паспрабуюць з'агітаваць адсталую

Падпарадкуем літаратуру — задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

Е. Пфляумбаум.

З пазмы „Кастрычнік“

дзень сьляпой
ірніца,
ражная
тым прывітаньнем...
. . . . . .
этуль гордае паданьне,
дзень прыйшоў,
і зоры палі ніц...
водблескам
зялі на ральлі,
буйным абвалам,
аменьне цалавала
на растні ўзышлі.
іхуры,
і песьня,
ываўлены,
храны сьцяг,
аглі,
алі,
пранесьлі
чотким
пуцінам жыцьця.
лаюмн,
пазалота і фрэскі
нам дасылалі
сьць звыш...
ні ы,
дні—арабескі,—
історыя,
што ж ты маўчыш?
ліся, ты іх на
бачыў
анорлівым
ў зірку раба,
а зьмерыў
песьні батрачай,
труты
з імем... „нарчма“
Ў дні і гады
разьмінуліся мены—
стрэчны і вораг
рыхтуе клінок,
сілы лютуюць
ў гранітавых вежах,
збройнай сымфоніі
рытым здалёк...
Стой, вартаўнічы,
весёлым дазорам
Ярка блішчаць
залатыя агні,
ў пульсе жыцьця
нячуваная скорасьць,
віхрам стагодзьдзяў
засьведчаны дні...
Згасае цень
на сьценах камяніц,
ліхтарных воч
прызыўнае мігценьне,
у роўнядзь шэрага каменьня
апалі зоры
залатыя
ніц...
і дзень ізноў...
Ў суладзьдзях гораду
мазаіка мэлёдый,
навычарпнага, бурнага жыцьця,
трызвоняць бронзаю стагодзьдзі
ў яго асфальтавы
прасьцяг.
І на мінулага касьцях
выпростваецца велі рыштаваньняў
і рытм адвечнага змаганьня
ўздымае свой пурпурны
сьцяг!

Э аб „Апошнім зьверыядаўцы“ М. Лынькова.

Мікуліч у сваёй рэцэнзіі аб зьверыядаўцы“ („Савецкая г. г. № 267) гаворыць, ны новы твор, адбіваючы п нашых дзён з пункту по- сы, заклікаючы будаваць пер- сьвеце краіну сацыялізму, прэчнае дасягненьне, аб якім рыць, якое трэба ўважліва аць“.

ым неабходным давесьці да Мікуліча, што марксыцкая расцэньвае творы ня толькі як яны адбіваюць сучас- е па таму, як яны заклікаюць і паляпшаць гэту су- Нам ужо вельмі мала спа- суючых фактаў твору, нам творы, якія робяць актыў- ча, натхняючы яго, штурха- рацьбу, на будову і г. д. інны зьмяшчаць у сабе ге- пнаньня сапраўднасьці. гэтага не хапае ў „Апошнім ўцы“ М. Лынькова. У рэцэн- зіі Крушынскім“ Бядулі лі аб лініі супраціўленьня, ажаецца ў нашай літарату- елі тады на ўвазе і «Апош- ыядаўца». Няма нічога больш к зваліць усю адказнасьць крымінальнага злачынца. ат нельга назваць клясавым настолькі яго злачынасьць

р савецкага заводу, які пры- і па фальшывых дакумантах, есец, ня мае ніводнай сама- умкі. Нельга-ж лічыць ідэй- асобныя думкі аб прыгожых страшэнную палахлівасьць то вось-вось яго выкрыюць. навека нельга назваць сьвя- годнікам. Ён, раней за ўсё, за сваю скуру, а таму сьвя- оды ніколі ня зробіць. ібольш дрэнным прадстаў ат сваёй клясы. Ён быў “ у кадэцкім корпусе і вы- ва брудэршафт лічылася вя- льбаю нават сярод белагвар-

аму такі вораг мала небясь- літаратурна-мастацкага боку клікае даверʼя. Гэты нікчэм- на сваёй драбязьлівасьці на- здолен ні на якую буйную

гуваем шкоднасьць таго, каго м моцным у сваёй варожай олькі такі вораг можа выклі- раціўленьне. пралетарска-мастацкага твору ьяўляцца ў тым, каб выклі- супраціўленьне, паказваючы і толькі ў яго адмоўных ры- і ва ўсіх яго станоўчых Мы павінны адчуваць вора- у яго вартасьцях, тады ён абіцца небясьпечным і поўна- упраціўнікам.

І апавяданьне Лынькова яшчэ далёка ад гэтай поўнацэннасьці.

У апавяданьні няма сутычкі паміж станоўчымі і адмоўнымі пачаткамі (нельга-ж лічыць адно выступленьне Кавэдлы поўнацэннай сутычкай).

Лынькоў зьбірае бытавыя непарадкі на заводзе: гразь у інтэрнаце, хуліганства, антысемітызм, гвалты над дзяўчатамі і г. д. і г. д., а барацьбы з усімі гэтымі варожымі нам настроямі ў яго няма.

Вельмі лёгка зрабіць віпаватым бязвольнага труса—дырэктара і выкрыўшы яго мінулае, лічыць, што гэта праблема вырашана. Справа, вядома, далёка не ў самім дырэктары, а ў пераважных настроях на заводзе, якія прынесены кулацтвам, дробнабуржуазнымі гаспадарнікамі ў асобе майстроў, у ольдзейнасьці лепшай часткі партыйнай ячэйкі. І як вырашаецца справа з гэтай ідэалёгічна адказнай і таму мастацка адказнай групай, мы ня бачым.

Ня бачым мы ня толькі таму, што за дырэктарам, найменш ідэалёгічна адказным персанажам, схавалася гэта адказнасьць, але і таму, што другое цэнтральнае месца ў апавяданьні займае змарнелая мяшчаначка, да якой прыхільны аўтар. Гэта на ёй сканцэнтраваны ўвесь трагізм апавяданьня, да яе хоча выклікаць аўтар спачуваньне, прычым гэта фігура пададзена ў гэткіх сэнтымэнтальных тонах, што навязвае асацыяцыю з традыцыямі, якія найменш заахвочваюцца ў расейскай літаратуры.

і ня гледзячы на тое, што скрыжаваньне ўплываў Бабэля і Горкага нічога не даюць, па думцы Мікуліча, таму, што пры сучаснай высокай тэхніцы мастацкай літаратуры, ніякае скрыжаваньне традыцый нас ня зьдзівіць (напрыклад, расейскі пісьменьнік Алёша, у якім скрыжаваліся ўплывы гэтых процілегласьцяў як Пётр Альтэнбэрг і Жан Жыроду), усё-ж у Лынькова надзвычайна дзяка знайсьці гэтыя традыцыі.

Ён ня дрэнна ўладае дыялёгам, што-ж датычыцца лірычных месц (а іх у яго шмат), дык яны напамінаюць... Карамзіна. Сыстэма яго эпітэтаў надзвычайна ня новая: валасы шоўкавыя, вочы сумныя, шыя лебядзіная і інш.

Агульнае ўражаньне ад апавяданьня такое: ня гледзячы на агульную правільную ўстаноўку, у ім няма барацьбы, няма вырашэньня ледзь намечанай праблемы. Побач з гэтым трэба адзначыць перавышаны сэнтымэнталізм, які зьяўляецца ня толькі адсталым элемэнтам формы, але і надае нежаданае шкоднае афарбаваньне такім пэрсанажам, як Валя і часткаю дырэктар.

С. Лендаў.

Сяргей Дарожны.

Грыміць мураваны бэтон...

Посяць цэглу
І песьні пяюць,
Гнуцца дошкі
Пад цяжарам ног.
Гром і стукат
І песьні плывуць
Над туманам
Ў сініх палёх.
Як пажар
На-пад борам зара,
Усьміхаецца,
Кліча здалёк...
Толькі ў кожнага
Вочы гараць,
Кожны рупна
Схіляе чало.
Кожны нечым
Вялікім занят
Над мурамі
Узведзеных сьцен.
. . . . . .
Звабна неяк
Цагліны зьвіняць
І сіней, на інакшаму,
Дзень.
Посяць цэглу
І песьні пяюць,
Гнуцца дошкі
Пад цяжарам ног.
Гром і стукат
І песьні плывуць
Разьвітацца
Ў асеньніх палёх.
Яшчэ многа
Патрэбна сіл,
Шмат імклівасьці
Руплівасьці шмат.
Каб у дальніх палёх
Каласы
Ураджайна шумелі
Нам.
Мо' загэтым
З відна да відна
Так лапочуць
Калёсы машын
І расьце за сьцяною
Сьцяна,
Урастаючы ў зорную
Сінь.
Глянь, таварыш!
Паслухай тут стань,
Лепшай песьні
Ня зложыць ніхто.
Як пяе гаварлівая
Сталь,
Як грыміць мураваны
Бэтон!..

Язэп Вазёрны.

Ты чуеш?..

Асеньняга лісьця
Узьвітраны бунт,
На рэйдзе асеньнім плянэта.
Дванаццаты камень
Заложан у грунт —
Будуем
Камуну
Сусьвету.
Хай Захад злуецца!
Хай лютуе Ўсход!...
Апошняя гэта іх песьня!..
Сягаем наперад,
Бліжэй 'шчэ на год
Да новых,
Да сонечных весьніц.
У моцы сьвядомасьць
І гонар такі:
Будуем мы шчасьце краіны!
Ты чуеш, таварыш?—
Грыміць малаткі!..
Ты чуеш?...—
Гамоняць турбіны.
Будуем!
А варта адмервае крок,
Будуем!
Растуць рыштаваньні
І коціцца песьня
Ў тумане здалёк
Пра наша жыцьцё
І змаганьне.
Асеньняга лісьця
Узьвітраны бунт,
На рэйдзе асеньнім плянэта.
Дванаццаты камень
Заложан у грунт —
Будуем
Камуну
Сусьвету!

ПЛЯН ЗАГАТОВАК—ВЫКАНАЦЬ ДАТЭРМІНОВА

Мясазагатоўкі пад пагрозай зрыву.

(*Мазыршчына*).

Малочжывёлсаюз, які зьяўляецца ў акрузе галоўным загатавіцелям мяса, заданьне па загатоўках жывёлы на кастрычнік месяц выканаў поўнасьцю, хаця гэтаму спрыяла ўключэньне ў гэтае заданьне астаткаў жывёлы ад летніх загатовак. Выкананьне лістападаўскага заданьня стаіць пад пагрозай недавыкананьня, асабліва па адкорму жывёлы, бо запасаў жывёлы ўжо няма і кіраўніцтва саюзу мясцовымі загатоўкамі недастаткова ўпарадкавана.

Гэты саюз, як маладая арганізацыя, наогул на загатавіцельным фронце да гэтага часу ня мае ў сваіх пізоўках загатавіцельных работнікаў, а там, дзе яны маюцца, дык некаторыя з іх зьняты з работы прайшоўшай чысткай каапэрацыйнага апарату. Зараз, на раду з выкананьнем мясазагатовак, стаіць вельмі востра пытаньне недахопу і адсутнічаньня загатавіцельных работнікаў у гэтай каапэрацыі.

Слаба ўцягваюцца ў мясныя загатоўкі малочжывёлатаварыствы, так як з ліку маючыхся ў акрузе 26 гэтых аб'яднаньняў вядуць загатоўкі—13. Пры такім становішчы працятваючыя весьці мясныя с-г крэдытныя таварыствы дагаворамі не ахоплены па загатоўкам жывёлы. З прычыны гэтага і ў сувязі з надыходзячай рэарганізацыяй с-г крэдытнай сыстэмы, некаторыя з іх работаюць інэртна і скарачаюць тэмп гэтай работы

З другога боку трэба адзначыць наяўнасьць ажытажу на мясным рынку і масавыя пераплаты на жывёлу ўсіх загатавіцеляў акругі, якія дэзарганізуюць мясны рынак. Мясгандаль, супроць устаноўленай цаны, пераплачвае да 3-х рублёў на пудзе жывёлы, а 16-га лістапада ўстаноўлена агульная пераплата па 15 шт. ватоў да 700 рублёў. Таксама, каб схаваць пераплату на сьвіным мясе, Мясгандаль купляе сьвіней не з разьліку 12 руб. 50 кап. за пуд, а паасобку плаціць за сала 24 р. пуд і за мяса—12 р. пуд., што ў агульным складае значныя пераплаты.

Акргандаль, замест рашучай барацьбы з падобнымі зьявішчамі, на заяве аб пераплатах не дазволіў праверыць каштоўнасьць ядаўна затрыманай жывёлы Мясгандлю.

У другім выпадку акргандаль затрымаў для праверкі каштоўнасьці 100 галоў жывёлы малочжылсаюзу; праверка яе зацягнулася па 10 дзён, жывёла хадзіла на ласкох, а разам з гэтым падала яна ў якасьці ад бескорміцы і ў рэалізацыі дала страту.

Усё гэта дае падставу сказаць, што складацца пагроза зрыву мясазагатовак наогул. Акруговая РСІ павінна пацікавіцца і віноватых прыцягнуць да адказнасьці.

М. З.

Загатоўкі ільну праходзяць слаба.

Гадавы плян ільнозагатовак па Аршанскай акрузе зацьверджан у колькасьці 2600 тон. Выходзячы з гэтага пляну, ужо дадзены заданьні ўсім аёнам і асобным загатавіцелям колькі яны павінны будуць даць ільну. У сучасны момант па акрузе распачынаецца работа па давядзеньню пляна ільнозагатовак да асобных вёсак і па прад'яўленьню цьвёрдых заданьняў кулаку. Усім райвыканкомам, загатавіцельным арганізацыям і сельсаветам прэзыдыумам акрвыканкому запрапанаваў правесьці сярод сялянства растлумачальную работу ў адносінах ільнозагатовак, каб навокал іх згуртаваць грамадзкую думку. Плянавае заданьне яркуецца выканаць у першым квартале на 60 пр ц, у другім па 35 пр. і ў трэцім на 5 проц.

Але ня гледзячы на гэта справа ільнозагатовак у гэтым годзе па акрузе разгортваецца вельмі і вельмі марудна. Кастрычнікавае заданьне ў 150 тон выканана толькі на 44 проц. Збор закантрактаванага праходзіць яшчэ горш: за кастрычнік месяц наступіла ўсяго 2,5 проц. гадавога заданьня па кантрактацыі. Гэтакае становішча стаіць над пагрозу выкананьне пляну па ільнозагатоўках і своечасовае забясьпечаньне тэкстыльнай прамысловасьці неабходнай сыравінай.

Каб больш узмацніць ільнозагатоўкі, прэзыдыум акрвыканкому запрапанаваў усім загатавіцельным арганізацыям—акргандлю, райвыканкомам і саветам надаць ільно-загатоўчай кампаніі баявы характар, праверыць наколькі падрыхтаваны загатоўчы апарат, якасьць працаўнікоў. ці ёсьць памяшканьні, прэсы, упаковачны матар'ял праверыць ці забясьпечаны ільнозагатоўчыя райёны патрэбнай колькасьцю прамтавараў, узмацніць загатавіцельны апарат добрымі працаўнікамі па ільнозагатоўках, маючыяся на складах гандлёвых арганізацый прамтавары накіраваць у ільнозагатоўчыя райёны.

Дняпросаюзу запрапанавана забясьпечыць усе ільнаводныя райёны прамтаварамі для прэміраваньня здатчыкаў ільну. Прымаюцца таксама меры да забясьпечаньня прэміраваньня ільноздатчыкаў грамадзкім кантролем, каб ня было прэміраваньня кулацкіх і заможных гаспадарак. Зьвернута ўвага ўсіх арганізацый на недапушчэньне прэміраваньня куладкіх гаспадарак—здатчыкаў ільну-хлебам.

Гэтыя мерапрыемствы павінны будуць разбудзіць загатавіцельныя арганізацыі, але пакуль што справа давядзеньня пляну да вёскі і па прад'яўленьню заданьняў кулаку—з мейсца не насунута, і ільна-загатоўкі ідуць павольна.

А. К.

Абараняюць клясавага ворага.

Надоечы прадстаўнік Рагачэўскага РВК Барысавец у вёсцы В.-Крушыкаўка праводзіў сход, на якім разглядалася пытаньне аб загатоўцы ільну.

На сход прышлі і беднякі і заможнікі. Вось пад уплыў апошніх і трапіў Барысавец. Клясавага падыходу ў разьмеркаваньні ільну ня было. У гэтым яму дапамагаў член сельсавету Ігнатаў Л.

Бедняку Сьвіркаву Міхасю наклалі 25 фунтаў. Гэты бядняк зусім ня плоціць падатку і мае зямлі ўсяго 3 га. У той-жа час заможнікам Кушнярову Аўхіму і Ісакову Пятру наклалі па пуду, у той час, калі яны маглі-б здаць па 20 пудоў.

Калі-ж некаторыя пачалі супярэчыць супроць такой раскладкі, дык Барысавец і слухаць не захацеў заўваг беднякоў.

Прадстаўнік РВК вольна ці міжвольна абараніў кулацкія гаспадаркі.

Я.

Забесьпячэньне працоўнага насельніцтва мясам.

Наркамгандлю даў заданьне Аршанскай акрузе загатавіць у мяса з агатавідельны сэзон 2212 тон мяса. Аднак, у сувязі з тым, што ў гэтым годзе, дзякуючы значнаму перасяленьню сялянства за межы акругі, значна паменшылася колькасьць дробнай і буйнай жывёлы, таксама, улічваючы тое, што і ў мінулым годзе заданьне, дадзенае акрузе ў 1800 тон было выкананa толькі на 84 проц., дадзенае заданьне па мясазагатоўкам на гэты год акругай можа быць выканана ня поўнасьцю. Ёсьць магчымасьць загатовіць толькі 1750 тон.

Такім чынам узьнікае неабходнасьць пераглядзець заданьне, дадзенае акрузе па мясазагатоўкам, аб чым ужо прэзыдыум акрвыканкому і паставіў пытаньне перад Наркамгандлю. Адначасова з гэтым прэзыдыум Акрвыканкому даручыў Акргандлю удасканаліць задавальненьне мясам гарадоў акругі і паставіць перад Наркамгандлем пытаньне аб поўным задавальненьні акругі мясам шляхам завозу, а таксама вызначыць усім райёнам і мясазагатавіцелям цьвёрдыя заданьні па загатоўкам мяса, пасьля таго, як кантрольныя плянавыя лічбы будуць канчаткова ўзгоднены з Наркамгандлем.

З мэтаю больш эканамічнага і правідловага выдаткаваньня мяса, апошняе будзе адпушчацца працоўнаму насельніцтву па нормам, устаноўленым СНК БССР, па заборным кніжкам, пры чым выдача мяса непрацоўнаму насельніцтву будзе спынена. Адначасова з гэтым, усім мясазагатавіцельным арганізацыям дадзена заданьне не пазьней 1 студзеня паставіць на адкорм рагатую жывёлу і сьвіней, а таксама і вывучыць пытаньне аб арганізацыі адкорму цялят, каб дзякуючы гэтаму мець магчымасьць забясьпечваць насельніцтва мясам без перабояў. У сучасны момант мясазагатавіцельныя арганізацыі распрацоўваюць пытаньне аб засолцы мяса.

Перад Наркамгандлем таксама пастаўлена пытаньне аб урэгуляваньні цэн на мяса, устаноўленых для Аршанскай акругі з цэнамі, якія існуюць у сумежных акругах.

М.

Жорстка пакараць кулака за падпал.

(Слуцкі раён).

Спачатку кампаніі былі вялікія непаразуменьні па пытаньню загатовак. Пляны хлебазагатовак былі даведзены да кожнага двара, інакш кажучы, цьвёрдыя нормы былі дадзены ня толькі кулаку і заможніку, але і серадняку, нават бедняку. Гэта толькі дапамагала кулацкай частцы вёскі. Такое становішча не магло не адбіцца на агульным ходзе хлебазагатовак. Некаторая частка сераднякоў у зьвязку з такім становішчам выступала супроць загатовак.

Толькі пасьля растлумачэньня ў друку Слуцкія арганізацыі зразумелі сваю памылку і ў свой час выправілі яе. На вёску былі кінуты работнікі, якія пачалі праводзіць работу па новаму.

Цяпер бядняцка-серадняцкія масы пайшлі за партыяй і на сходах сьмела патрабавалі ад кулака здачы лішкаў.

Вакол хлебазагатовак абвастрылася клясавая барацьба. Кулак не хацеў здаць сваіх пазіцый і ўсялякімі хітрыкамі імкнуўся выкруціцца. Пры здачы збожжа здаваў больш аўсу, ячменю і грачкі, пакідаючы сабе жыта і пшаніцу. Ён усялякім чынам імкнуўся адтягнуць тэрмін здачы хлеба. Толькі пасьля таго, як некалькі кулакоў было аштрафавана і было апісана некалькі кулацкіх гаспадарак, кулакі пачалі здаваць свае лішкі. Але і тут не абыйшлося бяз кулацкіх хітрыкаў. Некаторыя кулакі прывозілі пасаванае збожжа.

Неабходна адзначыць удзел настаўніцтва ў хлебазагатоўках. Частка настаўніцтва прымала актыўны ўдзел і дапамагала беднаце выяўляць кулакоў. Другая частка была ў баку і нічога ўдзелу ў кампаніі ня прымала. Знайшліся і такія настаўнікі, як Бараноўскі і Цэйка, якія галасавалі на сходах супроць хлебазагатовак. Дзівіцца тут няма чаго, бо Бараноўскага цесьць кулак і яму не хацелася „пакрыўдзіць“ яго.

У сучасны момант кулак пачынае адплачваць вясковым актывістам, якія дапамагалі выкананьню хлебазагатовак. У вёсцы Серагох кулакі падпалілі гумно камсамольца; згарэла ўсё збожжа. У вёсцы Лучніках хацелі спаліць каапэратыў, у якім знаходзілася шмат хлеба.

Гэта, праўда, яшчэ першыя выпадкі, але трэба адразу выявіць падпальшчыкаў і сурова пакараць іх, каб адразу спыніць кулацкую помсту.

К—ч.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Рух калектывізацыі на Бабруйшчыне.

Бабруйск, 30-XI. За час з 1 кастрычніка па 20 лістапада на Бабруйшчыне праведзена вялікая работа па калектывізацыі. Раёны па зімовы час склалі пляны па калектывізацыі, у якіх паставілі задачу калектывізаваць да вясны 1930 году 263 тысячы гэктараў. Да 20 лістапада па акрузе калектывізавана 90 тысяч гэктараў зямельнай плошчы.

Асабліва шырока разгорнута работа па калектывізацыі ў Жлобінскім раёне (калі ня лічыць масыва масавай калектывізацыі Рагачэўскага раёну, які абхапіў сабою звыш 80 тысяч гэктараў). За гэтыя паўтара месяца ў Жлобінскім раёне калектывізавана 10 тысяч гэктараў зямлі. Створан пэраг калгасаў, як'я налічваюць ад 1000 да 2.500 гэктараў зямлі. Вызначаны раёны масавае калектывізацыі.

Слаба пакуль што разгорнута работа па калектывізацыі ў Бабруйскім раёне. Ня гледзячы на тое, што тут за апошні час наглядаецца ажыўленьне гэтай работы, усётакі яна яшчэ не пастаўлена на належную вышыню.

За гэты час ўзбуйнены старыя калгасы за кошт аб'яднаньня і далучэньня пасёлкаў і вёсак па плошчы ў 9874 гэктары.

А. Дамброўскі.

Мерапрыемствы па ахове працы ня выконваюцца.

Ворша, 30-XI. Ня гледзечы на тое, што калумовы ўсюды па прадпрыемствах, установах і ў арганізацыях былі заключаны своечасова, выкананьне іх, асабліва ў галіне аховы працы, пачалося са значным спазьненьнем. Кіраўнікі некаторых прадпрыемстваў, як, напрыклад, цьвікавага заводу «Чырвоны Кастрычнік» і «Дубровенская Мануфактура», да аховы працы адносіліся без належнай увагі. Наогул на ўсіх прадпрыемствах выкананьне асобных мерапрыемстваў праводзіцца бяссыстэмна. Рабочы кантроль за выкананьнем мерапрыемстваў па ахове працы гаспадарнікамі адсутнічаў, навокал гэтага пытаньня ня была згуртавана грамадзкая думка, а Інспэкцыя працы ня прымала належных мер узьдзейнічаньня, каб гаспадарчыя органы своечасова і поўнасьцю выконвалі. У выніку ўсяго гэтага аказалася, што асобныя прадпрыемствы, як завод «Чырвоны Кастрычнік» і Дубровенская мануфактурная фабрыка ўмовы па ахове працы выканалі толькі часткова і ўсе сродкі, адпушчаныя на мерапрыемствы па ахове працы ня скарысталі.

Каб зьнішчыць гэтыя недахопы на далейшае, прэзыдыум Акрвыканкому прапанаваў Інспэкцыі працы прыняць актыўны ўдзел у складаньні прамфінпляну на 1929-30 год, уцягнуўшы у гэта рабочых і вытворчыя нарады з такім разрахункам, каб неабходныя мерапрыемствы па ахове працы былі фінансаваны і каб былі вызначаны канкрэтныя аб'екты работ у гэтай галіне. Таксама інспэкцыя працы павінна будзе наладзіць стары кантроль за выкананьнем прадпрыемствамі ўмоў па ахове працы і па скарыстаньню асыгнаваных на гэта сродкаў, прымаючы рашучыя меры да кіраўнікоў прадпрыемствамі, якія ня будуць выконваць умовы па ахове працы. Адначасова з гэтым, інспэкцыя працы павінна вывучыць эфэктыўнасьць укладаньняў у мерапрыемствы па ахове працы і ўстанавіць пэрыядычныя справаздачы перад рабочымі, як праводзіцца выкананьне гэтых мерапрыемстваў.

Акрвыканком таксама згадзіўся з тым, каб нескарыстаныя ў гэтым годзе сродкі на мерапрыемствы па ахове працы былі скарыстаны ў новым гаспадарчым годзе на новыя аб'екты работ.

Мэдабслугоўваньне рабочых Асінбуду.

Ворша, 30-XI. Згодна пастановы СНК Беларусі павінна быць палепшана мэдыка-санітарнае абслугоўваньне рабочых па будаўніцтве і торфараспрацоўвак Асінбуду. У выкананьне гэтай пастановы, а таксама і ў сувязі з тым, што лекавыя ўстановы Асінбуду перайшлі на бесперапынны працоўны тыдзень, прэзыдыум Акрвыканкому прапанаваў акруговаму інспэктарыяту аховы здароўя правесьці значнае пашырэньне лекавых устаноў на Асінбудзе.

У Выдрыцы штат лекавых устаноў будзе павялічан на адну санітарку. У Арэхах будзе адчынен стацыянар на 3 ложкі, а штат павялічыцца на аднаго ўрача, тры лекпомы і адну санітарку. На торфараспрацоўках будзе таксама адчынен адзін стацыянар на тры ложкі і работа ўрача і дантыста будзе не сезоннай, як гэта было да гэтага часу, а сталай, пры чым штат таксама будзе павялічан на адну санітарку. Асінбуд павінен будзе забясьпечыць усе лекавыя установы памяшканьнямі і абсталяваньнем, адчыніць у Арахах прачашную і ізаляцыйны барак для карантыну прыяжджаючых на Асінбуд рабочых.

Кулакі падпалілі хату.

22 лістапада адбываўся агульны сход сялян вёскі Мяркулавічы (Рагачэўскі раён, Бабруйшчына). На сходзе стаяла пытаньне аб перабудове сельскае гаспадаркі і перавагах калектыўных форм землякарыстаньня.

На сходзе прысутнічала ў большасьці беднота. Сярод іх было шмат сялян, якія парашылі арганізавацца калгас у вёсцы.

У самы разгар спрэчак і абмяркаваньня кулакі падпалілі хату, у якой адбываўся сход. Але, дзякуючы таму, што прысутныя своечасова прыкмецілі падпал, усе выбеглі з хаты і пагасілі пажар.

Так азьвярэлае кулаччо помсьціць беднаце. Але ўсё-ж такі, ня гледзячы на пагрозы і падпал, калгас будзе арганізаван.

Кр.

* * *

(*Ляднянскі раён, Аршанчына*)

Старшыня Слатаўскага сельсавету, Ляднянскага раёну Жупікаў Ігнат, быў вельмі добрым грамадзкім працаўніком і адміністратарам, праводзячы выразную клясавую лінію партыі ў сваёй рабоце.

Не спадабалася гэта кулацтву і іх прыхвасьням. Вось яны і парашылі адпомсьціць таварышу Жупікаву за зробленыя ім „крыўды“. Для гэтага кулакі карыстаючыся адсутнасьцю тав. Жупікава, запалілі яго двор.

Двор згарэў. Суседзі, якія хутка прыбеглі на дапамогу, выратавалі ад агню сям'ю і жывёлу. Злачынства дасьледуецца.

Сямёнаў Г.

Кулакоў не чапаюць.

(Быхаўскі р., Магілёўшчына).

Самаабкладаньне на 1927-28 год у нашым раёне выканана толькі на 68,8 проц., што складае 19991 рублёў. Сярод недаімшчыкаў у большасьці сваёй кулакі і заможнікі Лучыцкага і Грудзінскага с-с.

Асабліва слаба вядзецца работа па спагнаньню самаабкладаньня ў Клетнянскім, Макранскім, Кузькаўскім, Н-Быхаўскім і Лучыцкім с.-с.

Вучот па самаабкладаньню ў с.-с. пастаўлен дрэнна і нагляд з боку РВК недастатковы. Сродкі па самаабкладаньню ў некаторых сельсаветах скарыстоўваюцца не па назначэньню.

Падрыхтоўчая работа да самаабкладаньня на бягучы год пачала разгортвацца. Да першага сьнежня мае быць скончана правядзеньне сходаў па самаабкладаньню.

№.

АПАНАС-ПАСТУХ.

(*З падарожжа па Віцебшчыне*).

па дажджу з фурманам-селя- ніжджаем у лес. Халодны вецер па-за намі. Па шырокім полі, цы панура туліцца статак. ўкаватай сасны хмура прыхі- лавек. Ён апрануты ў доўгі з жупан, які быццам выцягну- ы. Ён пакінуў сасну і ідзе і нам. Невялікага росту, з арадою, у лапцёх.

аточкі, ці няма ў вас сярні- пытаўся ён у нас.

курыць хочаце?

, ня куру. Хачу раскласьці азяб ад гэтага дажджу.

ты па-салдацку набегаў-бы— яму фурман.—Бачу, што ня лдатах, таму і ня ведаеш сал- агравалкі.

арашылі дапамагчы пастуху ці агонь. Выцягнулі з-над ся- салому, дасталі з груду шы- Хутка засьвяціла полымя і пачаў яго хапаць пасінелымі

некаторы час з-за кус- ніжкі чалавек у доўгім ам армяку, галава яго была абвязана чымсьці падобным на мяшок.

— Гэта мая жонка ідзе,—паведаміў пастух.

— Добры дзень! — нясьмела сказала яна.

Перад намі стаяла высахшая, з тварам пожоўклага, што воск, колеру, вышэй сярэдняга росту, босая жанчына.

Расчырванелыя ступні ног высоўваліся з-над краёў змокнутага жупана. З кішэні яна дастала некалькі бульбін і кінула іх у попел.

Дождж ня сьціхаў. Кавалак неба, нібы шапкаю пакрываўшы праталінку, быў злучан з зямлею хмарамі і дажджом. Таму мы не сьпяшаліся пакінуць ясное зацішша і агонь.

Жонка пастуха прыносіла шчыгальніку, паленьня, клала іх на агонь, некалькі разоў перамешывала ў попеле бульбу, а потым пайшла да статку, які пачаў рухацца на другім канцы палянкі.

— Скаціна, бачыце, таксама любіць добрае кадвор'е, а ў холад, што шалёная бегае, заўважыў пастух.

— Нажаль, не дадумаліся яшчэ распраўляцца з гэтымі хмарамі,—закручываючы цыгарку, пачаў разважаць фурман,—з зямлёю саўладалі ўжо добра... Выпрасталі карак, які гнулі дзяды, бацькі ды і мы самі з пакон вякоў... Усё сабечылі... «Гэта маё»... «Гэта тваё»... А ў выніку—пан ды кулак сыты, а мы, як кажуць, „ні кала, ні двара“... Крыху пазнавата дадумаліся разбурыць гэтыя межы ды палоскі. Даўно - б іх да чортавай матэры трэба,—працягваў ён.

— Лепей позна, чым ніколі,—кажа прыказка,—заўважыў я.

— Так, сынок, „лепей позна, чым ніколі“, але ёсьць другая прыказка: „Пяць гадоў нявестка жыла і ня ведала, што іхняя сучка бясхвостая“.

— Што гэта значыць?—расьмяяўся фурман.

— А гэта значыць тое, што мы, напрыклад ня ведалі дзе карэньні цяжкасьці, пакуль не прачнуліся.

Вось мы цэлай вёскай вясною зрабілі калгас. Спачатку палохаліся некаторыя. Тое да сёе, як ды што... Але прыслалі два трактары... Загудзелі... Засакаталі яны... Пайшлі гуляць па полі... Зараз ужо сілком нікога ня выганеш назад. Дудкі... Толькі ўспамінаеш, чаму раней не дадумаліся да гэтага. А раней было так. Маеш у каліце—садзіць на куце... Убачаць за плячыма хатуль—пытаюцца:—адкуль?

— Чаму-ж вы не ў калгасе? Чаго ж вы чакаеце?

— Я чакаць ня буду... Вось скончу пасьвіць ды і лахі пад пахі адгэтуль...

— Куды-ж гэта, на перасяленьне?

— За дваццаць вёрст адсюль, у камуну.

Я паціскаў крэпка, горача руку Апанасу. Хацеў пайсьці да каня ўжо, але пачуліся крыкі жонкі пастуха.

— Апанас! Апанас! Воўк!—бязупынна крычала жанчына.

— Вунь, глядзеце, авечку панёс...—паказвала яна нам на край палянкі, калі мы прыбеглі.

Мы кінуліся сьледам за воўкам. Але ён з авечкаю схаваўся ў глыбіню лесу.

— Воўк у лесе, што кулак у вёсцы... Сачы за ім кожную хвіліну, а то нашкодзіць... Вось загутарыліся, а ён і хапануў.. Шостую сёлета, акаянны,—шкадаваў пастух.

— Вы едзеце ў камуну, таму кланяйцеся там таварышу Антонаву, старшыні іхняму ды і ўсім ад пастуха Апанаса. Перадайце, што хутка буду ў іх...

Мы паехалі. Чутна было, як заграла пастухова труба, музыка якой разьлівалася глуха па лесе.

Антось Дакука.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену артыкулаў 80, 332, увагі да артыкулу 333 і артыкулу 351 Грамадзянскага Кодэксу і пра дапаўненьне гэтага Кодэксу артыкуламі 19-а 210-а.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць зрабіць у Грамадзянскім Кодэксе наступныя зьмены і дапаўненьні:

1) Дапоўніць Грамадзянскі Кодэкс арт. 19-а ў наступнай рэдакцыі:

„19-а. Парадак карыстаньня фірмаю і зьмест фірмавай назвы прадпрыемстваў, якія належаць юрыдычным і фізычным асобам, назначаюцца правіламі палажэньня пра фірму за 22 чэрвеня 1927 г. (З. З. СССР 1927 г., № 40, арт. 395)".

2. Запісаць арт. 80 Грамадзянскага Кодэксу ў наступнай рэдакцыі:

„80. Права забудоўкі можа адчужацца, перадавацца ў спадчыну, а таксамэ, калі гэта прадугледжана ў дагаворы, аддавацца ў заставу.

Права забудоўкі і будынкі, што належаць рабочым жыляшчна-будаўнічым кацпэрацыйным таварыствам на праве ўласнасьці, могуць адчужацца дабравольна ці з публічных таргоў толькі іншым рабочым жыляшчна-будаўнічым каапэрацыйным таварыствам альбо дзяржаўным органам.

Права забудоўкі і будынкі, што належаць агульна-грамадзкім жыляшчна-будаўнічым каапэрацыйным таварыствам на праве ўласнасьці, могуць адчужацца дабравольна ці з публічных таргоў толькі іншай жыляшчна-каапэрацыйнай арганізацыі і дзяржаўным органам, а таксама прыватным таварыствам узаемнага будаўнічага крэдыту, членамі якіх яны зьяўляюцца, калі права забудоўкі альбо будынак ня будуць прададзены на таргох.

Права забудоўкі і будынкі, што належаць рабочым і агульна-грамадзкім жыляшчна-будаўнічым каапэрацыйным таварыствам на праве ўласнасьці, могуць аддавацца ў заставу толькі тым дзяржаўным органам, каапэрацыйным арганізацыям, прыватным таварыствам узаемнага будаўнічага крэдыту, калі яны зьяўляюцца іх членамі, якія, паводле іх палажэньняў альбо статутаў маюць права браць у заставу будынкі і права забудоўкі".

Увагу да арт. 80 пакінуць у старой рэдакцыі.

3. Дапоўніць Грамадзянскі Кодэкс артыкулам 210-а ў наступнай рэдакцыі:

„210-а. Калі перапрадаюцца бяз згоды дастаўляючай машыны арганізацыі купленыя на рату сельска-гаспадарчыя машыны і прылады да выплаты за іх усяе пакупнае цаны, дык дастаўляючая машыны арганізацыя і ўстанова сельска-гаспадарчага крэдыту могуць да тэрміну спагнаць усю нявыплачаную за гэтыя машыны і прылады плату з перапрадаўца і з купца перапраданай машыны з салідарнай іх адказнасьцю.

Незалежна ад гэтага перапрадавец у належных выпадках прыцягваецца да крымінальнай адказнасьці".

4. Выключыць з Грамадзянскага Кодэксу БССР увагу да арт. 332 і з тэксту арт. 332 наступныя словы:

„Фірма таварыства павінна зьмяшчаць паказаньне прозьвішчаў удзельнікаў і ўстанаўляецца ў дагаворы таварыства".

5. Увагу першую да арт. 333 Грамадзянскага Кодэксу запісаць у наступнай рэдакцыі:

Увага 1. У заяве аб рэгістрацыі поўнага таварыства павінны быць зьмешчаны зьвесткі, якія патрабуюцца палажэньнем пра гандлёвую рэгістрацыю (З. З. СССР 1927 г. № 57, арт. 579)".

6. Арт. 351 Грамадзянскага Кодэксу БССР запісаць у наступнай рэдакцыі:

„351. У заяве аб рэгістрацыі таварыства на веры павінны быць зьмешчаны зьвесткі, якія патрабуюцца палажэньнем пра гандлёвую рэгістрацыю (З. З. БССР 1927 г., № 57, арт. 579)".

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. Чарвякоў.

НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. Карклін.

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. Хацкевіч.

17 лістапада 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении ст. ст: 80, 332, примечание к ст. 333 и ст. 351 гражданского кодекса и о дополнении этого кодекса ст. ст. 19-а и 210-а.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР **постановляют**: внести в Гражданский Кодекс следующие изменения и дополнения:

1. Дополнить Гражданский Кодекс ст. 19-а в следующей редакции:

„19-а. Порядок пользования фирмой и содержание фирменного наименования предприятий, принадлежащих юридическим и физическим лицам, определяются правилами положения о фирме от 22 июня 1927 г. (С. З. СССР 1927 г., № 40, ст. 395)".

2. Изложить ст. 80 Гражданского Кодекса в следующей редакции:

„80. Право застройки может быть отчуждаемо, передаваться по наследству, а также, если это предусмотрено договором, обременено залогом.

Право застройки и строения, принадлежащее рабочим жилищно-строительным кооперативным товариществам на праве собственности, могут быть отчуждаемы добровольно или с публичных торгов только другим рабочим жилищно-строительным кооперативным товариществам или государственным органам.

Право застройки и строения, принадлежащее общегражданским жилищно-строительным кооперативным товариществам на праве собственности, могут быть отчуждаемы добровольно или с публичных торгов только другой жилищно-кооперативной организации и государственным органам, а также частным обществам взаимного строительного кредита, членами которых они состоят, если право застройки и строения не будут проданы с торгов.

Право застройки и строения, принадлежащие рабочим и общегражданским жилищно-строительным кооперативным товариществам на праве собственности, могут быть закладываемы только тем государственным органам, кооперативным организациям, частным обществам взаимного строительного кредита, если они состоят их членами, которые согласно их положений или уставов имеют право принимать в залог строения и право застройки."

Примечание к ст. 80 оставить в прежней редакции.

3. Дополнить Гражданский Кодекс ст. 210-а в следующей редакции:

„210-а. В случае перепродажи без согласия машиноснабжающих организаций купленных в рассрочку сельскохозяйственных машин и орудий до полной уплаты за них покупной цены, машиноснабжающие организации и учреждения сельскохозяйственного кредита могут досрочно взыскать все неуплаченные за эти машины и орудия плацежи, как с перепродавца, так и с покупателя перепроданных машин за солидарной их ответственностью.

Независимо от этого перепродавец в подлежащих случаях привлекается к уголовной ответственности".

4. Исключить из Гражданского Кодекса БССР примечание к ст. 332 и из текста ст. 332 следующие слова:

„Фирма товарищества должна содержать указания фамилий участников и устанавливается в договоре товарищества."

5. Примечание 1 к ст. 333 Гражданского Кодекса изложить в следующей редакции:

Примечание 1. В заявлении о регистрации полного товарищества должны содержаться сведения, требуемыя положением о торговой регистрации (С. З. СССР 1927 г. № 57, ст. 579)".

6. Ст. 351 Гражданского Кодекса БССР изложить в следующей редакции:

„351. В заявлении о регистрации товарищества на вере должны содержаться сведения, требуемые положением о торговой регистрации (С. З. СССР 1927 г. № 57, ст. 579)."

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР А. Червяков.

ЗАМ. ПРЕДСЕДАТЕЛЯ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР М. Карклин.

СЕКРЕТАРЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР А. Хацкевич.

17 ноября 1929 г.
г. Минк.

У БССР рэалізавана пазыкі індустрыялізацыі на 15977900 руб.

ПАВЯЛІЧАНАЕ ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАНА НА 138,3 ПРОЦ. ТРЭБА З ПОСЬПЕХАМ ЗАКОНЧЫЦЬ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ І Ў ВЁСЦЫ.

Паводле апошніх вестак Наркамфіну па ўсёй БССР рэалізавана 3-й пазыкі індустрыялізацыі на 15.977.900 руб. Такім чынам, **Савецкая Беларусь сваё павялічанае заданьне выканала ўжо на 138,3 проц.** З агульнай сумы падпіскі аформлена на 15.476.000 руб., што складае 96,9 пр.

Сярод асобных груп насельніцтва вынікі рэалізацыі гэткія: сярод рабочых і служачых рэалізавана пазыкі на 13.305.600 руб.—147,3 проц. кантрольнай лічбы; сярод сялянства—на 1,315.400 руб., або 73,1 проц. кантрольнай лічбы і сярод неарганізаванага насельніцтва гарадоў і мястэчак пазыкі рэалізавана на 1.356.900 руб.

З прыведзеных лічбаў мы бачым, што дагэтуль праца па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы праходзіць павольным тэмпам. Ёсьць нават цэлы шэраг скажэньня дадзеных дырэктыў на месцах, што тлумачыцца няўважлівымі адносінамі да распаўсюджваньня пазыкі сярод сялянства з боку фінорганаў, крэдытных таварыстваў, ашчадных кас і каапэрацыі. У той час, калі самая дробная частка аблігацыі каштуе 5 руб., ёсьць шэраг выпадкаў, як напрыклад у Чарэйскім раёне, калі падпісваюцца на пазыку на 1 руб. і нават на 50 кап. Ёсьць выпадкі ўжываньня мэтаду разверстки. Так, у Талочынскім раёне (Аршанчына) у вёсцы Гасьцініцы сход пастанаўляе падпісацца на 50 руб. і разьмеркаваць на кожную гаспадарку па 1 руб. 40 кап. У в. Мацьцева выносіцца пастанова падпісацца кожнай гаспадарцы па 1 руб. і ўносіць штомесяц па 10 кап. у той час, калі растэрміноўка сярод сялянства дапускаецца больш як на 6 месяцаў.

Разам з тым маюцца выпадкі, калі кулачло і іх падгалоскі сваёй агітацыяй спрабуюць сарваць рэалізацыю пазікі ў вёсцы. Напрыклад у тым-жа Талочынскім раёне ў в. Букавіна пад уплывам кулакоў сход выносіць пастанову аб тым, каб адмовіцца ад падпіскі на пазыку. Той, хто праводзіў у гэтай вёсцы сход ня змог паставіць пытаньне так, каб з дапамогай беднаты і серадняцтва даць належны адпор кулакам і падкулачнікам у іх злоснай агітацыі. Праўда, з часам справа была тут выпраўлена.

Ёсьць яшчэ шэраг глухіх куткоў, у якіх сялянства ня ведае аб 3-й пазыцы індустрыялізацыі і аб умовах яе выпуску.

Рэалізацыя 3-й пазыкі індустрыялізацыі ў вёсцы павінна закончыцца 31 сьнежня. Неабходна выправіць усе недахопы ў працы на прасоўваньню пазыкі ў сялянскія масы. Працоўнае сялянства БССР у пераважнай большасьці добра разумее неабходнасьць узмацненьня тэмпаў індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскае гаспадаркі і яно выканае свой абавязак перад дзяржавай, ажыцьцявіўшы лёзунг—піводнай гаспадаркі без аблігацыі пазыкі індустрыялізацыі.

РСІ прыступіла да праверкі падрыхтоўчай працы да будаўнічага сэзону.

Пытаньнем капітальнага будаўніцтва партыя і ўлада надаюць надзвычайна важнае значэньне. Гэта само сабой зразумела, бо калі вядучым пачаткам у разьвіцьці народнай гаспадаркі зьяўляецца прамысловасьць, то вядучым пачаткам ў разьвіцьці прамысловасьці, у сваю чаргу, зьяўляецца пашырэньне асноўнага капіталу, адзін з фактараў якога ёсьць капітальнае будаўніцтва. У капітальнае будаўніцтва мы кожны год укладваем пераважную частку народнага прыбытку. З другога боку—на фронце капітальнага будаўніцтва маецца вельмі многа прарэхаў. Мы ў будаўніцтве амаль зусім ня ўжываем індустрыяльныя мэтады вытворчасьці, будуем па-старынцы, часта без належнай падрыхтоўкі, без дастатковага эканамічнага і тэхнічнага абгрунтаваньня, з-за чаго бываюць выпадкі непатрэбных страт. Будаўнічы індэкс зьяўляецца да гэтага часу самым высокім. Якасьцю будаўніцтва мы таксама ня можам пахваліцца. Бываюць выпадкі, што прыходзіцца ламаць і перарабляць нанова.

Органы Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі праводзяць сыстэматычнае абсьледваньне становішча капітальнага будаўніцтва, каб сумесна з грамадзкасьцю і зацікаўленымі ведамствамі выправіць тыя недахопы, якія маюцца на фронце капітальнага будаўніцтва.

У сучасны момант НК РСІ прыступіў да праверкі падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону 1929-30 г. і вынікаў будаўніцтва мінулага году, наколькі дадзеныя раней дырэктывы былі выкананы. Абсьледваньне мяркуецца правесьці па Менскай, Гомельскай і Магілеўскай акругах сіламі НК РСІ, [illegible] Бабруйскай і Віцебскай акругах—сіламі акруговых [illegible] РСІ.

Гэту работу РСІ мяркуе правесьці шляхам самаправеркі апаратам будаўнічых арганізацый праз стварэньне час. кантр. камісій і рабочых брыгад, шляхам прыцягненьня спэцыялістых-дабраахвотнікаў РСІ.

Вакол гэтага важнага пытаньня неабходна таксама разгарнуць кампанію ў друку, каб шляхам самакрытыкі больш дэталёва выявіць ўсе балочыя мейсцы. Сьценкоры і рабкоры засьвятлялі на старонках друку пытаньні будаўніцтва, дапамажэце РСІ ў правядзеньні гэтай работы.

А. Жун.

Неактыўнасьць КСТУ ў справе зьбіраньня сродкаў.

Да 1-га сьнежня павінна быць сабрана 1.400.000 руб. 600.000 пуд. збожжа

Мы знаходзімся зараз перад фактам недапусьцімых адносін К-таў Узаемадапамогі да справы спагнаньня сяброўскіх узносаў і запазычанасьці па пасеньню. Да 1-га сьнежня г. г. КСТУ павінны сабраць да 1-го мільёну руб. сяброўскіх узносаў і спагнаць запазычанасьць па вясеньній сяўбе—600.000 пуд. збожжам і 400.000 руб. грашыма.

На справе-ж спагнаньне гэтых сродкаў праходзіць вельмі марудна, а часам і зусім не спагнаецца.

Вось факты: ў Рагачэўскім р. трэба сабраць 26.000 руб., у Жлобінскім—20.000 руб., у Гарадокскім—15.000 руб., Калінкавіцкім—15.000 руб., Чавускім—22.000 руб., Барысаўскім—17.000 руб. і г. д. Ці спагнаны гэтыя грошы? Не, не спагнаны. Нават у „прыкладных" раёнах сабрана меншаловы вызначаных сродкаў: У Смалявіцкім р. з 10.000 руб. спагнана толькі 3.000 руб., у Лупалаўскім р. з 18.000 руб.—4.000 руб., у Лязьнянскім р. з 10.000 руб.—4.000 руб., у Віцебскім р. з 18.000 руб.—10.000 р., у Пухавіцкім р. з 14.000 руб.—7.500 руб. Калі вышэйпералічаныя раёны хоць паведамляюць аб ходзе спагнаньня сродкаў, дык ад 31 раёну зусім ніякіх вестак.

На што патрабуюцца зараз гэтыя сродкі? У зьвязку з разгортваньнем калгаснага руху перад нашымі грамадзкімі арганізацыямі наўстас неадкладная задача дапамагчы батрацтву і беднаце ўваходзіць у калгасы, зьбіраць сродкі на наявныя ўзносы, дапамагчы калгасам набываць маншыны, розны інвэнтар, у пабудове прамысловых прадпрыемстваў. З другога боку, зараз патрабуюцца значныя сродкі на напаўненьне пракатных пунктаў, па набыцьцё насеньня да вясеньній сяўбы.

У сучасны момант, калі кожная капейка павінна быць на вучоце, нельга дапусьціць, каб спагнаньне гэткай вялікай запазычанасьці праходзіла б такім марудным тэмпам. Нельга дапусьціць, каб сяброўскія ўзносы ў 10—15 руб. з аднэй гаспадаркі, пераважна заможнай часткі насельніцтва—заставаліся ў кішэні капіталістычных элемэнтаў. Трэба рашуча разгарнуць кампанію на зьбіраньню запазычанасьці.

ХРОНІКА.

Арганізацыя буйнага ільнаводнага савгасу.

Учора на калегіі Наркамзему разглядаўся сьпіс спэцыяльных савгасаў. Водлуг гэтага сьпісу, вызначаныя савгасы будуць значна павялічаны за кошт акаляючых не занятых зямель і мэліяраваньня балот. Некаторыя савгасы павялічваюць свой плян удвойчы. Прычым кожнай гаспадарцы надаецца спэцыяльны ўхіл.

У Валынецкім р., Полацкай акр. арганізуецца буйны ільнаводны савгас. Гэты савгас (Баркавіцкі) арганізуецца часткова на асвоеных, часткова на [illegible] ніцных землях і зарасьніках—усяго на плошчы ў 6.000 [illegible]. Калегія Наркамзему пастанавіла ўключыць Баркавічы ў сьпіс спэцыяльных савгас. Белсельтрэсту суцольна з Полацкім АкрЗА запрапанавана зараз распачаць адмежваньне савгасу і ўжыць шэраг іншых мерапрыёмстваў, каб у наступную вясну можна было ў савгасе Баркавічы сеяць лён.

Электрафікацыя сельскай гаспадаркі.

Наркамзем вызначыў у 1929-30 г. пабудаваць у сельскіх мясцовасьцях 14 электрастанцый, з якіх 7 новых, а рэшта былі распачата яшчэ ў мінулым годзе. Кошт будаўніцтва гэтых электрастанцый абойдзецца ў 4 мільёны руб., укладаньні на гэты год вызначаны ў суме 1.555.000 р.

Электрастанцыя ў Клімавічах запраэктавана ў 2000 к. яна павінна даць сьвятло 8000 гаспадаркам. Таксама намечана пабудова электрастанцый у Ляднянскім, Аршанскім і інш. раёнах.

Калегія Наркамзему, дзе разглядалася гэта пытаньне, запрапанавала земляну ўвязаць плян электрафікацыі ў зьвязку з разгортваньнем суцельнай калектывізацыі ў Хойніцкім, Лоеўскім, Юравіцкім, Сьмілавіцкім і Ветрынскім раёнах.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

Паважаны тав. рэдактар!

У артыкуле вашай газэты ад 29 лістапада г. г. (аб працы Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру) надрукавана паміж іншым:

„Былі выпадкі антысэмітызму".

Гэтая выраза кідае пляму на ўвесь тэатр і усіх працаўнікоў тэатру і можа ўвесьці у дрэнныя думкі грамадзкасьць.

Мясцовы камітэт і дырэкцыя гэтым зазначаюць, што выпадкі п'яных і антысэмітызму наглядаліся з боку толькі адной асобы арт. Вандарэнкі, за што ён дырэкцыяй быў зволены з тэатру і нават выключан з саюзу прамастацтва, аб чым просім надрукаваць у чарговым № газэты.

Старшыня МК БДВТ Ліўшыц.
Дырэктар БДВТ Галубок.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

1-XII Беларускім дзяржаўным тэатрам пад кіраўн. Галубка ставіцца п'еса „Правакатар" у 5-ці актах і 6-ці абразох (пераклад з польскага Бусла). Білеты ад 12—2 і ад 6 да 10 гадзін. Пачатак а 8 з пал. гадзіне.

— Групком № 2 саюзу працасьветы, паведамляе, што 1-га сьнежня, а 7 гадз. у памяшк. 8-ай школы (Энгельса № 8) адбудзецца працяг агульнага сходу аб крытыцы і самакрытыцы.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

ча 1-ае сьнежня 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.87	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	129.50	131.50
Выйгр. пазыка 1929 г.	101.55	101.95
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.78	25.88
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.05	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.50	10.85
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.25	25.35
2 „ „ „ проц.	25.69	25.79
2 „ „ „ 6-проц.	25.69	25.79
12 проц. дз. паз. 1928 г.	102.82	102,87
11 пр. рэнтн. паз. 1927 г.	105.96	—

Паштовая скрынка

Лутарам допісаў: „Тэатральны і „Эканомія па адміністратары" — допісы накіраваны Полацкаму „БДВ адмаўляецца" і „Трэ[illegible] —НК Асьветы. „Цікавыя зьвя[illegible] шанскаму Акрана.

„Хаця вы і гаспадар раёну не па гаспадарску". Аршанс[illegible]

„Карысны працаўнік" і „Н[illegible] ны"—Менскаму Акрана.

„Патрэбна дапамога" — Акрана.

Адказны рэдактар П. Ш[illegible]

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА

Сёньня а 7 гадзіне ўвечары ў Доме Пісьм[illegible] (Савецкая, 68) адбудзецца спатканьне мастакоў г. М[illegible] пісьменьнікамі.

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Выступленьне мастацкай арганізацыі „Ромб" з дакладам [illegible] чых шляхох беларускага выяўленчага мастацтва.

2. Выступленьне Галоўмастацтва Наркамасьветы т. Некрашэв[illegible] меньнікаў, культадзелу ЦСПСБ, саюзу прац. мастацтва і інш. арга[illegible]

З 2-х гадзін дня ў Доме будзе адчынена невялікая [illegible] ка выяўленчага мастацтва (творы членаў арганізацыі [illegible] прысьвечанае спатканьню.

Запрашаюцца пісьменьнікі, мастакі г. Менску, [illegible] навуковыя і грамадзкія працаўнікі і іншыя.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".	З панядзелка 25 лістапада „ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫН[illegible] і кіно-хроніка Белдзяржкіно «Новы горад» Го[illegible] Пачатак а 7 гадзіне. Каса а [illegible]
КІНО «ІНТЭРВІЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 25 лістапада Выключны мастацкі фільм „ЧОРНЫ ПАРУС" [illegible] Звыш праграмы: ХРОНІКА САВКІНО № 6 Пачатак а 7 гадзіне.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР"	З панядзелка 25 лістапада „ВАНЬКА ІМСЬЦІВЕ[illegible] У 6 ЧАСТКАХ каса адчынена штодня з 2 гадзін [illegible]
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	З панядзелка 25 лістапада Бэстэр Кітон у амэрыканскай камэдыі „ГЕНЭРАЛ" Звыш праграмы: кіно-хроніка „Савкіно" № [illegible]

УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 мес.—90 кап. 3 мес. 2 р. 70 кап. 6 мес.—4 руб. год — 8 руб.

Чытайце і выпісвайце „САВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ"

БЕЛАРУСКУЮ ШТОДЗЁННУЮ ГАЗЭТУ

ОРГАН Ц. В. К. БЕЛАРУСІ

АДКРЫТ ПРЫЕМ ПАДПІСКІ на 1930 г.

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

ПАВІННА БЫЦЬ у руках кожнага актывіста, члена савету, настаўніка, агранома, урача і наогул савецкага служачага.

Падпіска прымаецца: паштовымі канторамі і аддзяленьнямі, лістаносцамі, упаўнаважанымі канторы газэты, кіёскамі комісіяў, агэнцтва друку і канторай газэты (Менск, 2-гі Дом Савецтваў).

СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА

ВЫШАЎ З ДРУКУ І ПРАДАЕЦЦА № 7 часопісі „УЗВЫШША" № 7

ЗЬМЕСТ:

Ул. Дубоўка—Крыху восені і жменька кляновых лістоў (вершы).
Кузьма Чорны—Лявон Бушмар (аповесьць).
С. Дарожны—Ліст з Палесься, За вучобай (вершы).
В. Шашалевіч—Воўчыя ночы (драматычныя абразы).
Максім Лужанін—Вершы каляровага алаўка.
Максім Лужанін—Бабіна лета (апавяданьне).
В. Брусаў—Мы, Трырэма, Муляр (вершы).
Крапіва—Пажар (байка), Курортны верш.
А. Адамовіч — ПАЎЛЮК ТРУС (артыкул).
Я. Доўгі—Латвійскі пісьменьнік Ян Райніс.
Л. Трыер—„Пра дым фабрычны, які я ня знаю адкуль ідзе".

Падпісвайцеся на часопісь „УЗВЫШША" на 1930 год

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

на 1 год	5 руб.
на 6 мес.	3 руб.
на 1 мес.	70 кап.

Ёсьць некалькі камплектаў часопісі за мінулыя гады.

Пры падпісцы на 1930 год і на камплекты даецца скідка і растэрміноўка.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў рэдакцыі „УЗВЫШША" (САВЕЦКАЯ 68, ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА), а таксама ўсімі выдавецкімі і паштова-тэлеграфнымі канторамі і ўпаўнаважанымі часопісі „УЗВЫШША".

УЧИТЕСЬ САМИ

РУССКОМУ ЯЗЫКУ по книгам:

1. Культура речи

Кратк. содерж.: выразит. чтение, запись на слух, составл. плана, связная рэчь, раб. над словарем, сжатое изложение, выдержки и цитаты, формулировки в деловой рэчи, стиль, знаки препинания, творч. работа (письмо, дневник, воспомин., автобиография и др.) Цена с пересыл. 1 руб. 80 к., в переп. 2 руб.

2. Как писать сочинения

Кратк. содерж.: темы, материал, вступление, предисл., заключение, повествование, описание, рассужд., типы сочин., характеристика, работа над словом, раб. над фразой. Разработ. планы сочин., практическ. упражнения. Цена книги с пересылкой 1 р. 75 к. Высыл. Изд-во БРОКГАУЗ-ЕФРОН, Ленинград, внутри Гостинного Двора, 124-8.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

Вышла з друку, паступіла ў продаж і рассылаецца падпісчыкам

„ПОЛЫМЯ"

БЕЛАРУСКАЯ ШТОМЕСЯЧНАЯ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, ПАЛІТЫКІ, ЭКАНОМІКІ, ГІСТОРЫІ, КРЫТЫКІ

№ 8-9

1929

Па тэхнічных прычынах нумар выйшаў з спазьненьнем.

У хуткім часе выходзіць з друку „ПОЛЫМЯ" № 10.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На год	12 р. — к.	на 3 месяцы	3 р. 25 к.
„ 6 месяцаў	6 р. 50 к.	Цана асобнага нумару	1 р. 25 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА. У рэдакцыі часопісі „ПОЛЫМЯ" (Менск, Савецкая, 63, Белдзяржвыдавецтва), у цэнтральнай кнігарні БДВ (Менск, рог Ленінскай і Савецкай), ва ўсіх акруговых аддзяленьнях БДВ, у аддзеле падпіскі Беларускага Аддзяленьня ГІЗ'а РСФСР (Менск, Савецкая, 54) і яго агентурай па акругах і раёнах ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах і аддзяленьнях, у Беларускім аддзяленьні Выдавецтва „Известия ЦИК" і „Правда" (Менск, Савецкая, 61) і яго пададдзяленьнямі (Гомель, Савецкая, 17; Віцебск, Ленінская, 11), а таксама і контрагентамі (Бабруйск, Магілеў, Жлобін), у канторы газэты „Бел. Вёска" (Менск, Савецкая, 63) і яе ўпаўнаважанымі і селькорамі ва ўсіх раёнах БССР.

РЕМЕСЛ[illegible]

столярное, токарное, слесарное [illegible] ницкое, кузнечное, гончарное [illegible] плетное. Кройка, шитье, вяза[illegible] шиванье, плетенье, выпиливан[illegible] жиганье, вырезанье, и мн. др. [illegible] те по книге П. ЛЕОНЬТЬЕ

„РУЧНОЙ ТРУ[illegible]

384 стран., 199 рисунков о об[illegible] работ и с указаниями по сам[illegible] ному изготовлению инструм[illegible] Цена с пересылкой 3 ру[illegible] Высылает Изд-во БРОКГАУЗ-[illegible] Ленинград, внутри Гостин. Двор[illegible]

Заочные курсы „ПОЛИТ[illegible] (сущ. 1917 г.).

1. Высшие счетные курсы.
2. Иностранные языки (англ. и [illegible]
3. Чертежно-конструкт. и худож[illegible] сы (строит., архитектур., м[illegible] шиностр. черчение и рисова[illegible]
4. Агрокурсы. Отделы: полево[illegible] животноводство.
5. Профессиональные курсы кр[illegible] нов. координатсистеме.
6. Курсы практич. знаний.

Предметы, бухгалтерия (общ. [illegible] фабр.-заводск., банков.), ком[illegible] ком. выч., корресп., делопроизв[illegible] нография, исправление почерка.

Подробн. прогр. и просп. [illegible] 20 к. мелк. почт. марк., адр[illegible] конверт. Ростов н-Дону. Курс[illegible] ЛИГЛОТ".

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вайскова-вучотная карт. аб[illegible] ці з вучоту за № 113 Цюхав[illegible] выд. Горацк. прызыўн. каміс., ка[illegible]

— Вучотна-вайсковая кніжка [illegible] Слышкіна В. І., выд. Горацк[illegible] кв. 165п.

— Вучотна-конская карт. [illegible] Слышкіна В. І., выд. Саўскі[illegible] кв. 165п.

— Вучотна-вайсковая карт. [illegible] Л. С., выд. Менакрваенкамат. [illegible]

— Вучотна-конская кніжка [illegible] выд. Брадоўскім с.-сав. Барысаў[illegible] кв. 167п.

Галоўлітбел 595.

Друкарня БД[illegible]